МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ПРАБЛЕМ КУЛЬТУРЫ

# СЦЭНАРНА-МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПРАВЯДЕННЮ КЛУБНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чэрвень

Мінск 1991

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ПРАБЛЕМ КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СЦЭНАРНА-МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ
# ПА ПРАВЯДЕННЮ КЛУБНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

Чэрвень

Мінск 1991

**У зборніку змешчаны матэрыял для правядзення свята Купалля, чарговы раздзел тэрміналагічнага зборніка – “Сацыялогія”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ISBN 5-7815-1097-4

С А. Аляхновіч, П. Гуд,

1991

# ОЙ, РАНА, НА ЙВАНА

## Метадычны дапаможнік па арганізацыі і правядзенню Купалля

Летняя ночка купальская, настоеная на водары кветак і траў, абмытая светлымі росамі, апетая ў шматлікіх народных песнях.

Радасна звіняць цымбалы, сотнямі зорачак узлятаюць у вечаровае неба іскры вогнішча, абвяшчаючы пачатак самага паэтычнага народнага свята. Ноч расквечваецца шматлікімі агнямі, карагодамі, святочнымі строямі дзяўчат, напаўняецца песнямі, у якіх гучыць любоў да зямлі, роднага краю.

Старажытнае народнае свята летняга сонцастаяння з кожным годам заваёўвае ўсё большую папулярнасць. Адраджэнню гэтага прыгожага, паэтычнага дзеяння надаюць увагі дзеячы культуры, вучоныя. 118 культурна-асветных устаноў Беларусі штогод прымаюць удзел у правядзенні Купалля, пераасэнсоўваючы традыцыйныя элементы, уносячы ў яго нешта новае, сваё. Так, у Гродзенскай і Мінскай абласцях у час свята арганізоўвавюцца конкурсы на лепшы букет кветак, у Брэсцкай – выстаўкі лекавых раслін. У Віцебскай вобласці ўдзельнікі купальскага абходу , шануючы старую традыцыю, прыбіраюць дзяўчыну «кустом» і спяваюць песню, якой пачынаецца свята, яны віншуюць людзей, якія нарадзіліся ў гэты дзень, запрашаюць іх асабіста. Гэта – прыкмета творчага развіцця традыцыі, нараджэння навацый, якія арганічна зліваюцца з ёй.

Але часта дзейснасць сцэнарыстаў і пастаноўшчыкоў Купалля, не падмацаваная трывалымі фальклорна-этнаграфічнымі ведамі, наносіць пэўную шкоду гэтаму прыгожаму і паэтычнаму святу. Так, у некаторых раёнах у склад дзеючых асоб Купалля ўводзяць Нептуна, кікімару – персанажаў, якія не з’яўляюцца традыцыйнымі для беларускай купальскай абраднасці; у танцавальных праграмах замест беларускіх народных мелодый гучыць рок-музыка ў выкананні амерыканскіх і заходнееўрапейскіх ансамбляў; выпадковы набор гульняў для гульнятэкі (тут можна сустрэць забавы самых розных народаў); у канцэртах разам з беларускімі наронымі песнямі і песнямі беларускіх кампазітараў гучаць песні народаў СССр; на многіх святах Купалля галоўнай святочнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стравай з’яўляецца шашлык. У выніку свята страчвае нацыянальны каларыт, культурна-бытавыя народныя традыцыі, парушаецца жанравае і стылявое адзінства Купалля.

Карацей кажучы, узнікае супярэчнасць паміж народнымі традыцыямі правядзення свята і практыкай іх увасаблення ў многіх раёнах рэспублікі, супярэчнасць, што можа быць вырашана толькі праз удумлівае выкарыстанне багацейшай купальскай спадчыны, якую мае беларускі народ.

У прапанаваным сцэнарыі выкарыстаны аўтэнтычны матэрыял свята з мэтай яго рэстаўрацыі, частковай рэканструкцыі і трансфармацыі. Разам з тым у драматургію Купалля ўключаны лепшыя ўзоры сучаснай купальскай абраднасці, якія арганічна ўліваюцца ў рэчышча беларускіх народных традыцый.

У сцэнарыі ўпершыню сабраны агульнанацыянальныя і тэрытарыяльна адметныя элементы свята, выкарыстоўваецца нотны матэрыял. Гэта зроблена для таго, каб арганізатары маглі, па-першае, убачыць, што сабой уяўляе Купалле ў поўным аб’ёме; па-другое, паказаць розныя варыянты ўвасаблення таго ці іншага фрагмента свята. Важна, каб пастаноўшчыкі не слепа капіравалі гэты сцэнарый, а ў адпаведнасці з мясцовымі ўмовамі набліжалі свята да аўтэнтычнасці , альбо рэканструкцыі і трансфармацыі.

Да ведама арганізатараў свята: у сцэнарыі, акрамя спецыяльна выдзеленых тэрытарыяльных гульнёвых адрозненняў, пры вызначэнні купальскіх песень таго ці іншага фрагмента ў дужках надрукаваны назвы раёнаў, дзе гэтыя творы былі запісаны беларускімі этнографамі і фалькларыстамі. Гэта дасць магчымасць пры ўвасабленні свята, абапіраючыся на дадзены матэрыял, шукаць мясцовыя песні для больш поўнага адлюстравання асаблівасцей святкавання Купалля ў вашай мясцовасці. Па ходу сцэнарыя прапануюцца песні, ноты да якіх дадзены ў музычным дадатку.

Трэба адзначыць, што Купалле на Беларусі не мела дакладнага парадку і рэгламентацыі гульнёвых дзеянняў. Усё залежала ад арганізатараў, ступені іх падрыхтаванасці, а таксама цікавасці, якую ўжзельнікі праяўлялі да той ці іншай дзеі. Таму і праграма гэтага сцэнарыя не можа быць не парушанай. Рэжысёры павінны кампанаваць эпізоды свята згодна з традыцыяй, якая існавала ў іх мясцовасці.

**Сцэнарна-рэжысёрскі ход свята** – апавяданне аб купальскіх звычаях беларускага народа, апавяданне, якое ўваскрашае купальскія легенды, паданні, увасобленыя затым у масава-іграваых і відовішчных дзеяннях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ажыццяўляюць сцэнарна-рэжысёрскі ход КУПАЛІШ І КУПАЛІНКА – традыцыйныя арганізатары забаўляльнай часткі свята Купалля на Беларусі.

**Мастацкі вобраз свята** ў агульным плане вызначаны так: агонь творчасці.

**У мастацка-дэкаратыўным афармленні** гэты вобраз адлюстраваны ў канструкцыі купальскага вогнішча і малых вогнікаў, вакол якіх будуць фарміравацца мізансцэны. Галоўнымі дадатковымі элементамі дзеяння будуць палаючыя паходні і шасты з коламі, рознаварыянтныя «вогненныя» плыты і вянкі са свечкамі, якія стануць асновай пластычнага малюнка. Другараднымі апорнымі элементамі свята з'яўляюцца рады, шатры, забудовы і атракцыёны купальскага кірмашу, хаты населенага пункта, дзе адбываюцца пластычныя дзеянні свята. Тэрыторыя свята ўмоўна падзяляецца на чатыры зоны дзеяння: вуліцы вёскі ці горада, дзе адбываецца Купалле, кірмаш, вогнішча, акваторыя ракі ці возера.

**У мызычным афармленні** мастацкі вобраз свята ўвасабляецца ў песенных спаборніцтвах юнакоў і дзяўчат, якія выконваюць жартоўныя купальскія песні; песеннай пераклічцы фальклорных калектываў, песнях-запрашэннях на свята; музычнай эстафеце фальклорна-інструментальных ансамбляў. Вобразны лейтматыў, які праходзіць праз усе эпізоды свята, - мелодыя цымбол і гукі сурмаў, што выпяваюць пачатковы радок беларускай народнай песні «Ой, рана, на Йвана».

**У пластычным вырашэнні** мастацкі вобраз свята пададзены праз традыцыйныя купальскія шэсці з палаючымі паходнямі, вяночкамі, карагоды, гульні.

**ПРАГРАММА КУПАЛЛЯ**

**«Запрашаем на Купалле»** – віншавальна-запрашальны абход хат;

**«Усе на свята!»** – карнавальнае шэсце ўдзельнікаў да месца правядзення Купалля;

**«Купальскі кірмаш»** – продаж традыцыйных святочных купальскіх страў, лекавых раслін, вырабаў народных умельцаў; беларускія народныя гульні, латарэя «Купальскія дары»; працуюць выстаўкі кветкавых пано і букетаў, самадзейных і прафесіянальных мастакоў; відэатэка «Спадчына», танцы;

**«Сыйдзі, сонейка, зайграй нам!»** – урачыстае адкрыццё свята, частаванне ўдзельнікаў купальскімі стравамі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**«Разгарайся, купальскі агонь!»** – легенда пра Ярылу, распальванне вогнішча, купальскія песні і карагоды;

**«Вогненнае ігрышча»** – купальскія гульні з агнём, скокі праз агонь;

**«Праводзіны русалак»** – легенды аб русалках, русальныя гульні;

**«Плыві, плыві, вяночак …»** – варажба на вянках;

**«Папараць-кветка ўзыходзіць»** – змаганне з «нячыстай сілай», пошукі «кветкі шчасця», купальскія забавы;

**«На Купала сонца йграла»** – шэсце да ракі, сустрэча сонца.

## «ЗАПРАШАЕМ НА КУПАЛЛЕ»

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці і ўсе жадаючыя збіраюцца ў канцы вёскі, мястэчка ці горада. Яны прыбраны ў беларускія нацыянальныя строі, падпяразаны палыном, упрыгожаны кветкамі, галінкамі дрэў а ў дзяўчат ускладзены на галовы прыгожыя вяночкі з васілёчкаў, жытніх каласоў, рамонкаў і іншых кветак. Самую прыгожую дзяўчыну, якая выбіраецца агульным рашэннем альбо пры дапамозе жэрабя, апранаюць «кустом» - прыбіраюць галінкамі дрэў.

Пачынаецца купальскі абход. Калі ў населеным пункце многа вуліц і ёсць некалькі купальскіх гуртоў, можна зрабіць так званы «зорны выхад» (удзельнікі апранутыя адпаведна купальскаму святу, збяруцца ў розных месцах, а затым, абыходзячы вуліцы і запрашаючы людзей на свята, сыходзяцца ў адным месцы для агульнага шэсця на свята). У тым ці іншым выпадку, пачынаецца свята Купалля, трэба абавязкова арганізаваць віншавальна-запрашальны абход дамоў.

Стаўшы ланцужком, дзяўчаты і хлопцы ідуць па вуліцы і спяваюць песню:

Сягоння Купалка, а заўтра Ян,
Да зайграй, сонейка, зайграй нам,
Каб залёныя лугі шумелі,
Каб сырая зямля стагнала,
Каб сырая зямля стагнала,
Да й ад дзявоцкага гуляння,
Да й ад жаноцкага спявання.

(Навагрудскі р-н, м. Кажан-гарадок Лунінецкі р-на)

Шэсце затрымліваецца ля кожнай хаты. Гучыць вясёлая музыка. Хлопцы і дзяўчаты запрашаюць жыхароў на свята:

–Сёння Купала, заўтра Ян,
Выходзьце, людзі, на свята к нам!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

–Пойдзем купальскі агонь раскладаці,
Усім дабрабыту і шчасця жадаці!

Фальклорны калектыў таксама далучаецца да запрашэння:

–Купала Яна на вулку звала:
–Хадзі, Яначка, хадзі на вулку,
Скрыпачкі граюць, дзевачкі пяюць,
Дзевачкі пяюць, Яначку ждуць.

х х х

Хадзі, Іван, на вулку к нам,
Лажы, Іван, купала нам,
Каб дзевачкі збіраліся,
На мёд, віно складаліся,
Наша Дар’ечка болей за ўсіх (тут называюць канкрэтнае імя)
Яе сужанька красней за ўсіх.
(в. Перасады Барысаўскага р-на)

х х х

Хадзіў Іван па вуліцы,
Ой, рана, на Йвана,
Маніў дзевак на вуліцу:
–Хадзіце, дзеўкі, на вуліцу,
Будзем пеці і гуляці,
Будзем агонь раскладаці.
(в. Вялікая Вяўрэнь Чашніцкага р-на)

х х х

Сягоння Купалле, а заўтра Ян,
Пойдзем, дзевачкі, у зялёны гай.
У зялёным гаі начаваць будзем,
Зялёныя вяночкі віць будзем.
(в. Кустын Брэсцкага р-на)

х х х

Пойдзем, дзевачкі, у чыстае поле,
У жыце купалачку сабіраць,
А ў жыце касцёр будзем раскладаць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Купальскую ночачку праважаць.

На Купалле запрашаюцца людзі розных узроставых груп, таму фальклорны калектыў павінен выконваць адпаведныя купалкі кожнаму чалавеку:

–Ой, маладая й маладзіца,
Ой, выйдзі выйдзі на вуліцу,
Кінь кужаліцу на паліцу,
Сама выйдзі на вуліцу,
Сама выйдзі на вуліцу,
Развядзі дзеўкам купальніцу.

(Маларыцкі р-н)

х х х

Дзеўкі, бабы, – на купальню,
Ой, хто не выйдзець на купальню,
Ой, той будзець пень-калода,
А хто пойдзець на купальню,
Ой, той будзець бел-бяроза.

(Ідрыцкі пав.)

х х х

Каго ж нету на вуліцы,
Палож яго калодаю,
Калодаю дубоваю,
Дзетак яго цыльпучкамі,
Цыльпучкамі альховымі,
Калодаю дубоваю,
Лянок яго травіцаю,
Травіцаю, павіліцаю:
Будзем палоць – рукі калоць,
Будзем браці – рукі драці.

(Чашнікі, Ляхавічы, Лепель, Крупскі р-н)

Калі ўдзельнікі купальскага шэсця падыходзяць да хат, яны не толькі запрашаюць людзей на свята, але і віншуюць песнямі тых, хто нарадзіўся ў Янаў дзень, дзяўчаткам ускладваюць на галовы вяночкі. Калі ў хаце жыве дзяўчына, якая ў бліжэйшы час збіраецца выйсці замуж, то ёй у якасці падарунка спяваюць песню:

–Купалначка, (кожны радок паўтараецца)
А дзе твая дочка?
Мая дочка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У садочку
Розу полець,
Паліваець,
Цвяточкі рвець,
Вяночкі ўець.
Усім дзевачкам
Па вяночку,
А Дунечцы (называецца канкрэтнае імя віншуемай дзяўчыны)
Тры вяночкі:
Адзін венчык –
Заляцальны,
Другі венчык –
Заручальны,
Трэці венчык –
Абручальны.

(в. Дуброва Бешанковіцкага р-на)

У некаторых раёнах цэнтральнай і паўночнай Беларусі дагэтуль існуе старажытны звычай адорвання купальнікаў. Песні гэтага плана ў поўным аб'ёме бытуюць у Міёрскім раёне Віцебскай вобласці. Да старэйшых жыхароў купальнікі звяртаюцца з наступнымі словамі:

Вечар добры, наша пані!
А ці прымеш нас з купалляй?
Калі прымеш – пакажыся,
А не прымеш – адкажыся.

Калі гаспадары доўга не выходзяць, затрымліваюцца альбо зусім адмаўляюцца, то купальнікі выконваюць розныя купальскія песні, запрашаючы гаспадароў усё ж такі выйсці на свята:

А на Яна ночка мала,
А я ўсю ночку не спала,
А я ўсю ночку не спала,
Усё купаллю збірала,
Усё купаллю збірала,
На лужочку па цвяточку,
На лужочку па цвяточку,
Усё насіла па дварочку,
Усё насіла па дварочку.
–Выйдзі, выйдзі, гаспадынька,
З бальшым сынам, з малым сырам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

x x x

–Выйдзі, выйдзі, гаспадынька,
Не глядзі крыва, прынясі сыра
І гарэлачкі ў бутэлечкі,
І закусачкі на талерачкі.

x x x

Хазяечка, не ляжы,
На вуліцу выхадзі, (кожны радок паўтараецца)
На вуліцу выхадзі,
Купальнічку падары;
А ці сала кусочак,
Ці яечак пяточак,
Ці піражка скарынку,
Ці цыбулі пярынку.

(в. Шалашына Дубровенскага р-на)

Хто, хто на Купалле ідзе,
Да хто, хто саладуху нясе,
Да хто, хто не вынесе,
З кравацi не вылязе?
Ляжа яна да калодаю,
Ляжа яна да дубоваю.

(в. Бараўцы Вілейскага р-на)

x x x

Добры вечар (паўтараецца пасля кожнага радка)
Добрым людзям!
Завем мы вас на Купала,
Купаленька, ноч маленька,
Ці дарыце, ці адкажыце.

(Дубровенскі р-н)

Калі гаспадары выходзяць з хаты з дарамі, купальнікі спяваюць:

–Купаленька, ноч маленька,
Добры вечар добрым людзям!
Спасіба вам,падарылі,
Купальнічкаў не пазнілі.

(Дубровенскі р-н)

У тым выпадку, калі гаспадары не выносяць дароў, купальнікі спяваюць:

Ты, хазяйка, не хавайся,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сыра, масла пастарайся.
Ты, хазяін, не ляніся –
Каля бочкі павярніся,
Не хадзі рабром,
Нясі піва вядром.

У час абыходу ўдзельнікі закідваюць на страху хаты нежанатага хлопца ці незамужняй дзяўчыны вянок і жадаюць ім хутчэй выйсці замуж ці ажаніціся.

Абышоўшы ўсю вуліцу, зрабіўшы «зорны выхад», удзельнікі свята збіраюцца ў пэўным месцы і выстройваюцца для правядзення ўрачыстага шэсця да месца правядзення свята.

**ПАРАДАК ШЭСЦЯ:**

—Юнак і дзяўчына ў беларускіх нацыянальных строях,якія нясуць сімвалічную выяву Купалля — кола, намаляванае на белай тканіне;

—група юнакоў, якія трымаюць у руках запаленыя паходні альбо шост, на версе якога ўмацавана палаючае кола;

—група юнакоў і дзяўчат, якія нясуць у руках «май»—сухія ствалы маладых бярозак, якія засталіся ад сёмухі;

—конь, запрэжаны ў воз, на якім — усялякая старызна:старыя чобаты, лахмаццё, анучы, розныя непатрэбныя рэчы,сабраныя з усяго населенага пункта;

—музыкі;

—дзяўчаты з вяночкамі;

—хлопцы, якія нясуць стравы для купальскай вячэры;

—астатнія жыхары.

У час урачыстага шэсця ўсе ўдзельнікі спяваюць:

Ішла Купала сялом, сялом,
Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
На Йвана Купала, на Йвана Купала (паўтараецца
пасля кожных двух радкоў)
Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
Вітала хлопцаў чалом, чалом.
Вітала хлопцаў чалом, чалом,
Свяціла ночкі агнём, агнём.
Свяціла ночкі агнём, агнём,
Пляла вяночкі шаўком, шаўком.
Пляла вяночкі шаўком, шаўком,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Слыла Купала цяплом, дабром,
Слыла Купала цяплом, дабром,
Славу Купалу пяём, пяём.

(Смаргонскі р-н)

З музыкай, спевамі, танцамі ўсе ідуць да месца правядзення свята.

## «КУПАЛЬСКІ КІРМАШ»

Удзельнікі свята, якія прыйшлі на Купалле як у складзе шэсця, так і асобна, праходзяць скрозь святочную браму, упрыгожаную гірляндамі з кветак і галінак дрэў, і трапляюць у рады кірмашу, якія размешчаны вакол цэнтральнага месца дзеі і працуюць да пачатку свята.

У эфіры гучаць беларускія народныя мелодыі ў выкананні фальклорна-інструментальнага ансамбля. Калі ёсць магчымасць падключыць гукаўзмацняльнік, то можна таксама выкарыстаць фанаграмы з запісамі лепшых фальклорных калектываў рэспублікі, якія выконваюць творы купальскай тэматыкі і народныя інструментальныя мелодыі.

## ЗОНЫ ДЗЕЯННЯ КІРМАШУ:

### І. КУПАЛЬСКАЯ «ЗЯЛЁНАЯ АПТЭКА»

Галоўнае месца ў гэтай зоне дзеяння займае рад шатроў з галінак дрэў. У шатрах гандляры ў беларускіх нацыянальных строях прапануюць удзельнікам свята раслінныя сродкі народнай медыцыны, якія збіраюць на Купалле (Іван-ды-Мар'я, расічка, чыстацел, заечая цыбулька, макрыца, аер, рамонкі, каласы жыта і да т. п.). Кожная лекавая расліна прадаецца ў асобным шатры з адпаведным надпісам. У асобным месцы супрацоўнікі мясцовай аптэкі наладжваюць продаж адвараў і настояў з лекавых зёлак, а работнікі кніжнага гандлю прапануюць удзельнікам свята выданні пра лекавыя расліны Беларусі, рэцэпты навуковай і народнай медыцыны, спосабы прыгатавання лекавых форм.

Да ведама збіральнікаў: расліны на Купалле трэба збіраць у полудзень, калі няма расы, тады яны лепш зберагаюцца. Зёлкі ж, пакрытыя расой, ці сабраныя пасля дажджу, хутка чарнеюць і псуюцца.

х х х

Побач з шатрамі купальскай аптэкі ў гандлёвай зоне размешчана выстаўка-продаж вырабаў народных умельцаў. На гэтай выстаўцы прадстаўлены ручнікі, шкатулкі, палатно, дываны, беларускае народнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзенне і іншыя вырабы народных майстроў, у якіх выкарыстаны раслінны арнамент.

У адным з куткоў гэтай зоны (пажадана, каб на невялічкім узгорку) знаходзіцца фальклорны калектыў, удзельнкі якога плятуць вянкі і спяваюць купальскія песні. Адна з купалінак праводзіць разам з гледачамі купальскую віктарыну, загадвае загадкі. (Пытанні ў канцы сцэнарыя.) Калі ёсць магчымасць падвесці да гандлёвай зоны электрычнасць, можна наладзіць продаж стэрэадыскаў з запасамі старадаўніх і сучасных купальскіх песень і мелодый.

## II. ВЫСТАЎКА-ПРОДАЖ КУПАЛЬСКІХ СТРАЎ

У радах гэтай выстаўкі ўдзельнікам прапануюць не толькі абрадавыя стравы, а і розныя прадукты, якія ўжываліся на Купалле. Гэту выстаўку можна арганізавацъ у двух варыянтах:

1. Традыцыйныя мясцовыя стравы.
2. Стравы ўсіх рэгіёнаў Беларусі з выдзеленнем асобнага месца для мясцовых страў.

Арганізатарам неабходна ведаць, што амаль на ўсёй Беларусі ў абрадавую купальскую вячэру ўваходзілі сочні, кулага (акрамя заходняй Беларусі), сыр, тварог, халаднік, верашчака, квас, цыбуля, часнок. Акрамя таго, у Заходняй Беларусі на купалъскай вячэры ўжывалі яешню, у Паўночнай — кілбасы (рэцэпты страў дадзены ў канцы сцэнарыя). На сучасных купальскіх святах у большасці раёнаў Беларусў у якасці спецыяльнай купальскай стравы сталі ўжываць кісель. Арганізатарам свята трэба абавязкова распытаць сталых людзей, якія стравы ужываліся ў вашай мясцовасці. У выніку пошукаў можна знайсці незафіксаваныя этнографамі стравы, якія прыдадуць гэтаму фрагменту вашага свята адметную асаблівасць. На выстаўцы-продажы купальскіх страў можна арганізаваць (як асучаснены элемент купальскай вячэры) продаж прахаладжальных напіткаў, а таксама гарбаты з лекавымі раслінамі.

## III. ПАЛЯНА МАСТАЦТВАЎ

У адным з маляўнічых месцаў тэрыторы свята (на беразе ракі ці возера, на узлессі ці ўздоўж жытняга поля) знаходзіцца зона мастацтваў. Тут удзельнікі свята могуць агледзець і даць сваю ацэнку кветкавым пано — конкурснай вы-стаўцы, у якой прымаюць удзел як асобныя грамадзяне, так і творчыя калектывы школ, сярэдніх : вышэйшых навучальных устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў. У кампазіцыях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кветкавых пано фантазія ўдзельнікаў павінна адлюстраваць канкрэтныя сюжэты купальскага свята, яго сімволіку, купальскія звычаі і традыцыі. Тут жа ўдзельнікам свята прапануюць прыняць удзел у конкурсе на лепшы купальскі букет, які састаўляюць з загадзя падрыхтаваных кветак, траў і розных галінак. Кожнаму букету удзельнік павінен даць сваю назву, якая адпавядае тэматыцы свята.

Побач з выстаўкай кветкавых пано размешчана мастацкая выстаўка, на якой самадзейныя і прафесіянальныя мастакі дэманструюць і прапануюць гледачам малюнкі і жывапісныя карціны на купальскую тэматыку. Мастакі-маменталісты на асобных аркушах паперы з купальскай сімволікай малююць партрэты ўдзельнікаў свята, якія потым дораць ім ці прадаюць па дагаворных цэнах.

Адным з яркіх элементаў паляны мастацтваў з'яўляецца відэатэка «Спадчына»— лёгкая канструкцыя, пабудаваная пад дрэвамі ў форме лілеі. Тут да пачатку свята гледачы могуць прагледзець відэафільмы з выступленямі аўтэнтычных фальклорных калектываў, якія выконваюць купальскія песні, або відэазапісы ранейшых купальскіх святкаванняў у гэтай мясцовасці. Пад адным з дрэў размешчаны кінаманітор, які дэманструе мастацкую стужку кінастудыі «Беларусьфільм» — «Ноч на Івана Купалу».

Прыцягальным месцам паляны мастацтваў з'яўляецца таксама латарэя «Купальскія дары», у якой разыгрываюцца ў якасці прызоў вырабы народных умельцаў, купальскія стравы, літаратура аб Купаллі, кветках, лекавых раслінах, творы самадзейных і прафесійных мастакоў, дыскі з запісамі фальклорных калектываў. Тэрыторыя латарэі агароджана гірляндамі з кветак, галін дрэў. Уваход аформлены ў выглядзе брамы, аздобленай кветкамі. На браме надпіс: «Латарэя «Купальскія дары». Ля брамы — столік, за якім прадаюцца латарэйныя білеты. У цэнтры агароджы — канструкцыя двухметровага «рамонку» з вялізнымі пялёсткамі, на адваротным баку якіх напісаны назвы прызоў, што тут разыгрываюцца. Удзельнік, набыўшы білет, падыходзіць да «рамонку», адрывае пялёстак і атрымлівае прыз. У гэтай латарэі разам з каштоўнымі прызамі павінны быць і «суцяшальныя» — букеты кветак, палыну, крапівы, розныя вяночкі і да т. п.

## IV. ГУЛЬНЁВАЯ ПЛЯЦОЎКА

На гульнёвай пляцоўцы, размешчанай на адной з палянак, грае фальклорна-інструментальны ансамбль. Тут, згодна са старадаўняй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

купальскай традыцыяй, да пачатку свята моладзь наладжвае танцы, праграма якіх павінна быць складзена з твораў народнай харэаграфіі. Удзельнкі танцавальнага калектыву запрашаюць «няўмек» у круг і развучваюць з імі розныя народна-бытавыя танцы. У перапынках паміж танцамі праводзяцца гульні.

**1.«Купальскія гонкі»**

Дзве каманды хлопцаў, упрогшыся ў воз, на якім сядзяць дзяўчаты, бягуць да дрэва, якое стаіць ад лініі старта на адлегласці 40—50 м, і вяртаюцца назад. Выйграе каманда, якая прыйдзе першай. Прайграўшыя адкупляюцца — хлопцы дзяўчатам-пераможцам дораць кветкі, а дзяўчаты прайграўшай каманды ўзнагароджваюць хлопцаў-пераможцаў пацалункамі.

**2. «Назаві кветку»**

Паміж дрэвамі нацягваюць вяроўку. Дзве каманды становяцца ля яе канцоў і кідаюць праз вяроўку вянок. Хто падхапіу вянок, павінен назваць кветку і кінуць вянок назад. Калі ігрок адной з каманд не назаве ці паўторыць ужо названую кветку,— ён выбывае з гульні. Перамагае каманда, у якой застаецца больш удзельнікаў, ці барацьба ідзе да пераможнага канца, пакуль не застанецца адзін удзельнік.

**3.«Перацягванне ў квадраце»**

Для гульні патрэбна тоўстая вяроўка 10-метровай даўжыні, канцы якой звязаны. Чацвёра ігракоў бяруцца за вяроўку і ўтвараюць квадрат. На адлегласці 3м ад кожнага ўдзельніка на зямлі кладуць галінку бярозы ці ўторкваюць гэту галінку ў зямлю. Па сігналу вядучага ўдзнльнікі пачынаюць цягнуць вяроўку кожны ў свой бок, каб дацягнуцца да сваёй галінкі і ўзяць яе. Перамагае той, хто раней схопіць галінку. Пасля гэтага да вяроукі падыходзіць новая чацвёрка удзельнікаў і гульня зноў паўтараецца. «Перацягванне ў квадраце» варта правесці пяць разоў: чатыры туры выяуляюць фіналістаў, а пяты – абсалютнага пераможцу гульні, які узнагароджваецца прызам – букетам кветак або вянком.

**4. «Перацягванне»**

Калі на месцы дзеяння ёсць ручаіна або невялікая рэчка – цераз яе працягваюць доугі тоўсты канат. Удзельнікі (можна з розных вёсак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вуліц і раёнаў), стаўшы сваёй камандай на процілеглых берагах, звязваюць свае паясы з канатам. Па сігналу вядучага каманды цягнуць канат кожная ў свой бок, стараючыся зацягнуць сапернікаў у ваду.

**5. «Бег на бочачках»**

На лініі старта ляжаць тры бочачкі. Трое ўдзельнікаў з раз- бегу робяць скачок на бочачку і, перабіраючы нагамі (як бы ідучы па бочачцы), коцяцца на ёй наперад. Перамагае той, хто раней пройдзе загадзя вызначаную дыстанцыю.

**6. «У пупы»**

Для гэтай гульні патрэбны іўкі даўжынёй каля 1м і цурачка даўжынёй 10 і таўшчынёй 8см, якую ставяць на зямлю і называюць «пуп». Ігракі адыходзяць ад яго прыблізна на 10м і, кідаючы свае кійкі, стараюцца збіць «пуп». Хто пер-шы прамахнецца,— становіцца «пастухом» і павінен стаяць ля «пупа» і ставіць яго на месца, калі «пуп» збіваюць.

**7. «Апука».**

Гуляюць дзве каманды. Кожная выбірае вядучага. На пляцоўцы праводзяць 2 лініі паміж камандамі на адлегласці 30 —40м. Удзельнікі каманды «горада» па чарзе кідаюць бітай у апуку (мяч памерам з тэнісны) у бок праціўніка (у поле). Калі іграві «палявой» каманды зловяць мяч на ляту, каманды мяняюцца месцамі. Калі мяч не злоўлены, «палявыя» іграві падхопліваюць яго і ад сваёй лініі кідаюць у ігрока «гарадской» каманды, які ў гэты момант павінен дабегчы да чужой лініі і вярнуцца да сваіх; калі мяч пападзе ў яго, каманды таксама мяняюцца месцамі.

**8. «Була»**

Гуляюць дзве каманды. Кожная выбірае вядучага. Ён моцна б'е палкай з загнутым канцом па буле (драўляным шары) і гоніць яе па зямлі ў бок праціўніка, каманда дапамагае яму. Праціўнікі стараюцца перахапіць яе і вярнуць на ўмоўную мяжу.

**9. «Іванка»**

На зямлі чэрцяць круг дыяметрам 5-6м. У сярэдзіне яго — квадрат каля 1м$^2$. Гэта — дом «лесавіка». Сюды кладуць Іванку(лялька). Затым выбіраюць «лесавіка». Астатнія — «лебедзі». Залятаючы ў «лес»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«лебедзі» імкнуцца схапіць Іванку і вынесці адтуль. «Лесавік» павінен галінкай дакрануцца да «лебедзя». «Лебедзь», да якога ён дакранецца, выбывае з гульні. Каму ўдасца вынесці з «лесу» Іванку,— той становіцца «лесавіком». Гульня заканчваецца па жаданню ігракоу, калі праводзіцца чарговая замена «лесавіка» або калі ён выведзе з гульні усіх «лебедзяў».

## «СЫЙДЗІ, СОНЕЙКА, ЗАЙГРАЙ НАМ!»

На пляцоўку выходзяць чатыры сурмачы ў беларускім нацыянальным адзенні (юнакі, што сімвалізуюць сабой чатыры пары года).

Велічна і ўрачыста гучаць пазыўныя сурмаў, якія выпяваюць пачатковы радок беларускай народнай песні «Ой, рана, на Йвана».

І СУРМАЧ: Сягоння Купала, заўтра Ян,
Сыйдзі, сонейка, зайграй нам.
ІІ СУРМАЧ: Як будзе сонейка йграць —
Мы пойдзем Купала спяваць.
ІІІ СУРМАЧ: Будуць дзевачкі краскі рваці,
Будуць Яна успамінаці.
IV СУРМАЧ: Пачнем мы касцёр раскладаць,
Купальскую ночачку праважаць
РАЗАМ: Сягоння Купала, заўтра Ян,
Да зайграй, сонейка, зайграй нам!

Недзе за межамі рытуальнай пляцоукі, у лесе ці хмызняку, пачынае гучаць песня, якую выконвае фальклорны калектыу:

А на Купалу
Рана сонца йграла,
Рана сонца йграла
На добрыя годы,
На добрыя годы,
На цёплыя росы,
На цёплыя росы,
На хлябы-ураджаі,
На хлябы-ураджаі.

(в. Барсукі Віцебскага р-на)

У паветры звініць мелодыя траістай музыкі. Пачынаецца святочнае шэсце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПАРАДАК ШЭСЦЯ**

Юнак, які нясе вымпел з выявай сімвала купальскага свята — кола.

Купаліш — юнак у беларускім нацыянальным адзенні, упрыгожаным кветкамі.Ён вядзе каня, на якім сядзіць Купалінка — статная русавалосая дзяўчына ў беларускім нацыянальным строі, аздобленым жывымі кветкамі і вянкамі (на рукавах, шыі, галаве). У руках Купалінка трымае кошык з кветкамі, якімі яна ў час праезду абсыпае ўдзельнікаў свята.

Чатыры юнакі з палаючымі паходнямі;

Музыкі;

Фальклорны калектыў у вянках з кветак і жытнёвых каласоў;

Дзяўчаты з купалъскімі стравамі.

І СУРМАЧ: Купаліш і Купалінка да нас набліжаюцца,
Нашае свята **распачынаецца!!!**

Пад музыку ўдзельнікі святочной працэсіі з'яўляюцца на рытуальнай пляцоўцы, накіроўваюцца да сцэнічнага ўзвызшша і становяцца ў загадзя вызначаных месцах: на фоне вялізнага дэкаратыўнага сонца ўмацоўваецца эмблема Купалля, паабапал яго — юнакі з паходнямі, за імі — фальклорны калектыў і дзяўчаты з купальскімі стравамі. У цэнтры — Купаліш і Купалінка.

Гучыць напеўная мелодыя цымбал.

КУПАЛІНКА:Добры вечар, зямліца родная,
Пачынаецца свята народнае.

КУПАЛІШ: На Яна-Купала з хаты
Выйшлі малойцы, дзяўчаты,
Выйшлі падлеткі і дзетк!,
Дзяды, маладзіцы, кабеткі,
Ой, колькі народу багата
Сабрала купальскае свята!

КУПАЛІНКА: Сёння
Будуць музыкі іграці
Сёння
Будуць дзеукі гуляці,
Малодачкі спяваці,
Старыя бабы сядзеці
Ды на тое дзіва глядзеці.

КУПАЛІШ: Хай вяселле звініць у наваколлі
Шануючы спадчыну матчыну.

РАЗАМ: Са святам купальскім вас, людзі, вітаем,
На пачастунак усіх запрашаем!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучыць музыка. На пляцоўку выходзяць дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных строях, якія нясуць на вышытых ручніках купальскія стравы.

1.Белы сыр з маслам;

2.Хлеб і цыбулю;

3.Рыбу з перцам і алеем;

4.Взрэшкі з пастарнакам і цыбуляй;

5.Піражкі з макам;

6.Кулагу.

Абыходзячы ўдзельнікаў свята, дзяўчаты запрашаюць людзей пакаштаваць традыцыйныя стравы беларускага Купалля. У час агульнага частавання фальклорны калектыў выконвае песню.

Ой, рана, на Йвана (паўтараецца перад і пасля кожнага радка)
Проці Йвана ночка мала.
–Дзе, Купала, начавала?
–Начавала ў чыстым полі,
У чыстым полі сярод жыта.
–Чым, Купала, вячэрала?
–Варэнічкі вячэрала.
–Чым, Купала, запівала?
–Гарэлачкай запівала.

## «РАЗГАРАЙСЯ, КУПАЛЬСКІ АГОНЬ!»

Гучыць мелодыя цымбалаў.

**Купалінка:** Старажытныя сказы крывічоў данеслі да нас скарбы беларускай міфалогіі, данесл! паданні пра купальскі агонь... Слухайце, людзі, легенды зямлі нашай...

(Мелодыя цымбалаў узмацняецца, а затым, трохі сдішыўшыся, пераходзіць у шырокую апавядальную плынь.)

Па начах, калі сонейка ў вырай хавалася, хадзілі па зямлі моцы злыя – слугі Чарнабогавы: чарты хвастатыя, ведзьмы пачыналі гулі чорныя, з людзей здзекаваліся, безабаронных страшылі... І запальвалі тады крывічы агонь, што прынёс ім бог Ярыла, і разганяў той агонь сьценні чорныя, людзей цешачы, цеплыню даючы... Але калі перасталі людзі галінкамі вярбы агонь падсычваць, на варце яго ў пуні сядзець не сталі, пакінуў аднаго дня агонь людзей. А калі пакінуў агонь хаты людскія, падсцярог яго Яшчар люты – слуга Чарнабога і прывабіў ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агонь у нетры свае марскія, у харомы падземныя. І аплутаў там, сілу адняўшы, богу Ярыле рукі вадаростамі да скалы прыкаваў...

(Мелодыя цымбалаў набывае трывожнае адценне.)

На калені ўпаў народ, Ярылу-бога клічучы. Але цемрадзь халодная зноў над зямлёю пануе. І змілавалася тады над людзьмі Рада-багіня, навучыла старых вешчуноў, як бога Ярылу з мора ратаваць, ад Яшчара вызваляць, ласку ягоную зноў здабыць.

(На плошчу выходзяць хлопцы з язычніцкім знакам Купалля — двукрыжам і пачынаюць здабываць агонь трэннем.) Зрабілі людзі па загаду старых жэрдку доўгую, пры канцах па пярэчыне прывязалі. І, узяўшыся за парэнчы-жэрдкі рукамі, пачалі яе па дзеравіне туды і назад цягаць, каб скры-жаваннем гэтым зарок Яшчараў з Ярылы-бога зняць, з марскіх харомаў Яшчаравых вызваліць. Дарма шалелі моцы чорныя, дарма страшылі. Упарты быў чалавек.

І стаўся чаканы цуд!

(Гучыць пераможная мелодыя цымбалаў, пад двукрыжам Ярылы з'яуляецца агонь.)

Закурэўся пад дрэвам дымок і спалахнуў агонь у цемры бліскучым полымем.

(Юнак падымае ўверх палаючае дрэва.) Вызвалены быў Ярыла-агонь, цяпер Купалаю названы, бо ў моры купаўся, у нетрах марскіх. І радасць зноў вялікая была між людзьмі ў гэтую ноч. Палалі на ўзгорках агні, ачышчаючы ад грахоў людзей. Грымелі песні, славячы Купалу — другі прыход Ярылаў на зямлю.

Хлопец, стаўшы на калена, запальвае паходню ад агню Ярылы. У гэты час фальклорны калектыў спявае:

Ты узыйдзі, месячык,
Ты узыйдзі, ясьненькі,
Распалі нам Купаллейка,
Хлопчыкам на іgranейка,
Дзевачкам на гулянейка!

КУПАЛІШ: Раскладайце паліне Купалля агні!
Не затым, каб ускрэсла мінуўшчына,
А каб лепей убачыць наступныя дні,
Да вытоку душой дакрануўшыся.

КУПАЛІНКА: У адзінстве чалавека і прыроды,
Здаецца, таямніца гэтай ночы,
Аб гэтым і рака, і лес шапочуць,
І зорачак далёкіх карагоды...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучыць музыка. Юнак у беларускім нацыянальным адзенні, несучы ў руках паходню, запаленую ад «Ярылавага агню», робіць рытуальны абход вакол канструкцыі вогнішча і спыняецца. А ў паветры разносяцца словы купальскай песні ў выкананні фальклорнага калектыву:

Ой, рана, рана,
Ой, рана на Йвана
Выйшлі дзеўкі на луг,
Ой, ды сталі ў круг.
Ой, рана, рана,
Ой, рана на Івана,
Выйшлі хлопцы на луг,
Ой, ды сталі ў круг.
Ой, рана, рана
Ой, на Івана,
Распалілі касцёр,
Ой, ды гулялі да зор.

(в. Чырвоная зорка Клецкага р-на)

Хлопец падносіць палаючую паходню да кастра. У запанаваўшай цішыні чутны толькі трэск галінак, галля, карэнняў дрэў. Агонь, хутка ўзбегшы па саломе, якая абкручана вакол высокага шаста, дабіраецца да кола... І вось ужо сухія сасновыя іголкі, якія пышна акаймляюць кола, узлятаюць угару сотнямі вогненных зорачак. А людзі з захапленнем назіраюць гэтае незвычайнае відовішча – палаючае вогнішча.

КУПАЛІНКА: Сягоння й Купала, заўтра Ян,
Да зайграй, сонейка, заиграй нам.
Каб зялёныя лугі шумелі,
Каб сырая зямля стагнала.

КУПАЛІШ: Каб сырая зямля стагнала,
Да й ад дзявоцкага гуляння.
Да й ад дзявоцкага гуляння,
Да й ад жаночага спявання.

Гучыць музыка. Вакол купальскага вогнішча пачынаюцца спевы. Фальклорныя калектывы і астатнія ўдзельнікі выконваюць купальскія песні. Пачынаецца своеасаблівы канцэрт-пераклічка купальскіх хораў. Можна зрабіць так, што фальклорныя калектывы пасля выканання сваёй песні будуць перадаваць палаючую паходню суседзям, і яна як агонь творчасці будзе пераходзіць з рук у рукі, а песня — як душа Купалля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будзе заставацца ў людскіх сэрцах. Заканчваецца канцэрт-пераклічка агульнай песняй:

Ой, рана-рана ды на Яна
Да ўся зямля дрыжэла з Купалы.
Да зямля дрыжэла з Купалы,
Да лясы звінелі, як мы пелі.
Да лясы зашелі, як мы пелі,
Сяло разлягалася з музыкі.

(Быхаўскі, Нясвіжскі р-н)

КУПАЛІНКА: Разгарайся, купальскі касцёр,
Нашы песні ляцяць аж да зор...

КУПАЛІШ: А цяпер увесь народ,
Запрашае карагод.

Гучыць музыка. Удзельнікі свята ствараюць ля вогнішча некалькі кругоў і водзяць карагод, спяваючы песню:

Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зеляненькім,
А ў лузе цвітуць цвяточкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі
Многа песень спета
Пра шчодрае лета,
Толькі Ганначка не спявае,
У буйных травах кветкі збірае.
Кветкі сабірае
Ў вянок уплятае.
–Пакаціся, вяночак, у дварочак,
Дзе жыве мой мілы дружочак.
Хай ён знае, знае,
Хто яго чакае,
Хай вячэрняй роснай парою
Ў луг зялёны прыйдзе за мною.
Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зеляненькім,
А ў лузе цвітуць цвяточкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі.

Прапануем таксама карагод «На Йвана Купала». Пасля агульнага карагода дзяўчаты становяцца ў свой круг, а хлопцы – у свой. Кругі стаяць адзін за другім. Дзявочы круг рухаецца у адзін бок, хлапечы – у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

другі. У час руху адна з дзяўчат (ці хлопец) неўпрыкмет выходзяць з круга. Карагод суправаджаецца песняй «Ідзе, ідзе карагод».

Песня спыняецца, і кожны хлопец павінен стаць ля сваей дзяўчыны, а дзяўчына – ля свайго хлопца. Каму не хапіла пары той – становіцца вядучым. Карагод праводзіцца некалькі разоў.

Пасля карагода Купаліш і Купалінка разводзяць хлопцау і дзяўчат па розныя бакі вогнішча. Гучыць музыка, і ўдзельнікі свята пачынаюць выконваць жартоўныя купальскія песні і прыпеўкі, у якіх падсмейваюцца над недахопамі асобных хлопцаў і дзяўчат, або прадстаўнікоў іншай мясцовасці. Перамагае каманда, якая апошняй ставіць кропку ў гэтым спаборніцтве. Гэты агульнабеларускі фрагмент Купалля стварае атмасферу весялосці і носіць імправізаваны характар. (Прыкладныя тэксты сучасных жартоўных купалак дадаюцца ў канцы сцэнарыя. Старажытныя жартоўныя купалкі змешчаны ў кнізе «Купальскія і пятроўскія песні»–Мн., 1985.)

**«ВОГНЕННАЕ ІГРЫШЧА»**

Гучаць пазыўныя сурмы. На ўзвышшы ў суправаджэнні хлопцаў з палаючымі паходнямі з'яўляюцца Купалінка і фальклорны калектыў.

КУПАЛІНКА: Пачынаем вогненыя пацехі Купалля!

Фальклорны калектыў, падзяліўшыся на дзве палавіны, разыходзіцца па розныя бакі вогнішча, спяваючы:

Сягоння Купала, а заўтра Ян,
Будзем кідаць дзевак цераз паркан.
Сёння Купалле, заўтра Пётр,
Будзем кідаць хлопцаў цераз плот.
(в. Калоднае Столінскага р-на)

Гучыць музыка. Дзяўчаты рыхтуюцца да скачкоў... Нарэшце найсмялейшая з іх разбягаецца... І ў гэты момант хлопцы спяваюць або крычаць:

–Сёння Купала, заўтра Ян.
Кідаў дзевак цераз паркан.

Калі дзяўчына пераскоквае цераз касцёр, то атрымлівае пахвальныя рэплікі гледачоў, а калі не — то ўсе завуць яе «ведзьмай». Скокі працягваюцца да той пары, пакуль усе дзяўчаты не апынуцца на супрацьлеглым баку вогнішча.

КУПАЛІНКА: Запрашаем хлопцаў пераскочыць цераз вогнішча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучыць музыка. Хлопцы збіраюцца ў круг і па чарзе бяруцца рукамі за шост. Каму не хопіць месца на шасце, той павінен спачатку пераскочыцьцераз хлопцаў, якія становяцца нагнуўшыся ўрадок, а затым – цераз вогнішча. У гэты час дзяўчаты спяваюць:

Сёння Купала, а заўтра Ян,
Кідаў чорт хлопцаў цераз паркан,
А хлопчыкі дзевак прасілі:
–Дзевачкі-сястрычкі,ратуйце.
Хаця адну жэрдачку адкіньце.
А дзевачкі хлопцаў ратавалі,
Яшчэ болей жэрдачак наклалі.
(в. Карцэвічы Несвіжскага р-на)

Хлопцы зноў бяруцца рукамі за шост і выяўляюць наступнага. Такім чынам усе хлопцы пераскокваюць цераз касцёр.

У Міёрскім раёне Віцебскай вобласці, каб вызначыць, хто з хлопцаў будзе скакаць, робяць наступнае: хлопцы збіраюцца ў круг і пад музыку перадаюць адзін другому шост з палаючым колам, замацаваным наверсе. Калі музыка спыняецца, то хлопец, у якога ў руках апынуўся шост, перадае яго суседу і робіць скачок цераз вогнішча. Затым гульня паўтараецца зноў і зноў, пакуль усе хлопцы не пераскочаць.

КУПАЛІНКА: А цяпер мы запрашаем нашых бацькоў, дзядоў і бабулек успомніць маладосць і зрабіць скачок, але не цераз вогнішча — гады не тыя, а цераз кучу крапівы-жыгучкі!

Пад музыку старэйшыя людзі пераскокваюць цераз крапіву.

КУПАЛІНКА: Просім нашых дзетачак-малалетачак
Пераскочыць цераз букеты кветачак!

Пад музыку дзеці, якія знаходзяцца на свяце, пераскокваюць цераз кветкі, якія ляжаць на зямлі ў форме вяночка або проста раскіданы на траве.

Пасля адзіночных пачынаюцца парныя скачкі, якія робяцца па дамоўленасці дзвюх асоб процілеглага полу. Акрамя гэтага агульнанацыянальнага варыянту змовы, на Беларусі і зараз у гэтым фрагменце свята існуюць тэрытарыяльныя адрозненні.

**1. МАГІЛЕЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ**

Юнакі і дзяўчаты дзеляцца на два гурты і становяцца вакол вогнішча, тварам да яго.

КУПАЛІНКА: А зараз настаў час
На вянках гадаці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свайго суджанага выбіраці.

КУПАЛІШ: Дзевачкі із васілёчкаў,
З муравы зялёнай
Зрабілі вяночкі,
Быццам бы кароны.

КУПАЛ1НКА: Ляці, ляці, вяночак,
Злаві яго, дружочак...

Дзяўчаты па чарзе кідаюць праз агонь вянкі, суправаджаючы кідок словамі:

Ляці, ляці, вяночак,
Злаві яго, дружочак.

Калі вянок пападае да дзяўчыны, тая кідае яго назад, таму што вянок, які ляціць цераз агонь,— гэта сімвалічнае запрашэнне хлопца на парны скачок. Калі вянок пападае да хлопца і ён прымае запрашэнне дзяўчыны, то ён павінен разарваць вянок, а калі не — то кідае яго назад. Але дзяўча-ты заўсёды стараюцца зрабіць так, каб не было адмовы.

## 2. ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, БАРЫСАУСКІ Р-Н МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ, ЛЕПЕЛЬСКІ Р-Н ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Дзяўчаты ў вянках з кветак і жытнёвых каласоў, а таксама хлопцы ўтвараюць карагод, у цэнтр якога становіцца засватаная дзяўчына і пакрывае свой твар чубром (пакрывалам). Карагод спявае:

Ішла Купала сялом, сялом,
Закрыушы вочкі чубром, чубром...

Дзяўчына ў цэнтры кланяецца на чатыры бакі, а затым выбірае сабе хлопца «да пары». Выбраны хлопец здымае з дзяўчыны накрывала і перавязвае сабе руку альбо плячо. Гэта падарунак «на рукавы». У час музычна-песеннага дзеяння хлопцам дазваляецца «падаваць голас», каб дзяўчына пачула свайго каханага. У гэтым варыянце змовы ў цэнтры карагода можа быць адначасова некалькі засватаных або толькі выйшаўшых замуж купалак, што стварае пэўныя цяжкасщ пры адшуканні сваёй пары: голас адначасова могуць падаваць усе хлопцы.

Пасля адзіночных скокаў цераз агонь і выбару пары фальклорны калектыў спявае:

–Купалначка, дзе твая дочка?
Каліна! (паўтараецца пасля кожнага радка)
–Мая дачушка ў гародзе,
Угародзе лянок поле,
Лянок поле, краскі шчыпле,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краскі шчыпле, вянкі ўе,
Вянкі ўе, на сябе кладзе,
На сябе кладзе, да шлюбу йдзе.

(в. Замошша Барысаўскага р-на)

КУПАЛІНКА: Па старадаўняй купальскай традыцыі, запрашаем хлопцаў і дзяўчат на парныя скокі цераз агонь.

КУПАЛІШ: Станьце па парах і моцна трымайцеся за рукі.

Калі ў час скокаў цераз агонь вашыя рукі не разыдуцца, то гэта — добрая прыкмета: вяселле ў гэтым жа годзе павінна адбыцца!

Парныя скокі могуць суправаджацца народнай інструментальнай музыкай або купальскімі песнямі ў выкананні фальклорнага калектыву:

— А на Яна ночка мала,
Ночка мала.
А я ўсю ночку не спала:
Розныя зёлкі збірала,
Таму-сяму прадавала,
А міламу даравала.

(в. Рабунь Вілейскага р-на)

х х х

— Каліна! Каціўся каштан па сенажаці, каліна,
(«Каліна» паўтараецца ў пачатку і ў канцы кожнага радка.)
Хацеў Колечка Таню ўзяці,
Хацеў узяці — не умее жаці:
Нажала снапок — зламала сярпок,
Нажала другі — зламала і тэй,
Купіў новы – не ўмее горы.

(в. Кімія Барысаўскага р-на)

— На сенажаці мядуначка,
Каліна (паўтараецца пасля кожнага радка)
Там кукавала зязюлечка,
Там кукавала, праўду казала:
— Не йдзіце, дзеукі за старых замуж,
І не йдзще за маладых,
А йдзіце, дзеўкі, роўна сабе.
За старым мужам удавой будзеш,
За маладым — жабраваць будзеш,
А роўня сабе — панаваць будзеш.

(в. Метлічыцы Лагойскага р-на)

Але вось заканчваюцца парныя скокі цераз агонь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

КУПАЛІНКА: Распалілі мы купаллейка
Хлопчыкам на іграннейка,
Дзевачкам на гуляннейка,
Жаночкам на пяяннейка.

КУПАЛІШ: Да нябёс ляціць агонь,
І пяе, грыміць гармонь,
Бубен б'е, скрыпачка грае,
Усіх на танцы запрашае.

Пачынаецца танцавальная праграма. На Беларусі ў старадаўнія часы моладзь вельмі часта йшла ў танок пад прыпеўкі. І мы прапануем зберагчы гэтую традыцыю, дадаўшы свае прыпеўю да п-рыпевак Міншчыны:

–Гарманіст, веся лей,
Нашых ножак не жалей
Нашы ножкі не баляць,
Яны хочуцъ танцаваць.

х х х

Іграйце, музыкі,
У мяне лапці вялікі,
А мне маці напляла,
Каб было да Пятра.

х х х

На Купаллі скрыпка грае,
Мяне маці не пускае.
—Пусці, маці, паглядзець,
Сабе зяця будзеш мець.

х х х

Рассыпся, гарох
У чатыры кучкі,
А ў нашага гарманіста
Залатыя ручкі.

х х х

Танцавала, топнула,
Аж спадніца лопнула,
Прашу, дазвольце падвязаць,
Пайду яшчэ я танцаваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

x x x

Чаго йдзеш, чаго йдзеш,
Чаго цягнешся,
Чаму мяне не бярэш,
Толькі дразнішся?
Усім песням канец,
Пайшлі дзеукі ў танец,
А за імі парася
Растапырылася. (І да т. п.)

Танцавальная праграма працягваецца. У перапынках купалкі праводзяць «вогненныя гульні».

**1. «Купальскія кідальнікі»**

Да вогнішча хлопцы выносяць чэрап каровы, каня ці свінні, авечкі, які ўмацаваны на шасце. Пачынаецца спаборніцтва кідальнікаў. Хлопцы і дзяўчаты па чарзе кідаюць у яго каменнямі, суччам, галінкамі дрэў. Каму ўдаецца збіць чэрап у касцёр, той аб'яуляецца пераможцам, яму дораць букет кветак і даюць права першаму запрасіць на танец любую дзяўчыну (або хлопца).

**2. «У гарэлыша»**

Іграки становяцца пара за парай, а спераду, спіной да пар, становіцца гарэлыш. Ён павіней стаць прама і ні ў якім разе не глядзець па баках. Калі ўсе станукъ, гарэлыш гаворыць:

—Гару!

—Яму адказваюць:

—Гары, гары ясна, каб не пагасла. Пых!

Тады задняя пара, раздзяліўшыся, абягае ўдзельнікаў гульні і стараецца з'яднацца. Гарэлыш павінен пачуць, што яны бягуць, і злавіць аднаго з іх. Калі зловіць, то становіцца парай наперадзе усіх, а гарэлышам робіцца той, хто застаўся без пары. Тады гэтак жа бяжыць наступная пара і г. д. Часам пярэдняя пара стараецца заглушыць шум бягучай пары ці, наадварот, крычаць:

—Бягуць! Бягуць!

Гарэлыш зрываецца з месца, калі задняя пара яшчэ стаіць, што выклікае агульны рогат.

**3, «Вогненныя вершнікі»**

Па сігналу вядучага вершнікі павінны на конях праскакаць праз калідор гледачоў і скочыць цераз касцёр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## «ПРАВОДЗІНЫ РУСАЛАК»

Гучаць пазыўныя сурмы («Ой, рана, на Йвана»). Чуецца напеўная мелодыя цымбалаў.

КУПАЛІНКА: На Беларусі ў адзін з дзён зялёных святак і аж да Купалля, да Пятра бавіліся русалкі. Як гавораць народныя паданні, русалкі — вадзяныя німфы, жылі ў рачных зарасніках і раз у год выходзілі з вады. У тыя дні збіраўся люд па гаях, прылеглых да жытніх загонаў, дзяўчаты вілі вянкі з бярозавых галінак, праважалі русалку ў поле, каб аберагала хлябы-ураджаі.

Кажуць паданні, калыхаліся русалкі на галінках, гучным смехам вабячы да сябе кожнага, каго ўбачаць, каб яго потым заказытаць.

КУПАЛІШ: Усю Сёмуху, аж да Купалля, аж да Пятра было забаронена людзям пляскать у далоні, купацца ў рэчках. Бо было гэта вялікоднае свята русалак, якое належала святкаваць разам з імі, каб не наклікаць на сябе іх гневу.

КУПАЛІНКА: Мноства легендаў зберагплося ў народзе аб русалках, якія сёння завітаюць да нас на свята.

Недзе за межамі пляцоўкі гучыць русальная песня:

На граной нядзелі русалкі сядзелі,
Русалкі сядзелі, на бога глядзелі.
А бог сына жэне, Ілля дочку ’ддае,
Ой, рана-рана, Ілля дочку ’ддае.
На новай сялібе пшаніца стаяла,
Ой, рана-рана, пшаніца стаяла.
Пшаніца стаяла, каласком махала,
Ой, рана-рана, каласком махала.
Каласком махала, галаском крычала,
Ой, рана-рана, галаском крычала,
— Дзевачкі ж, сястрычкі, падайце ж вадзічкі,
Ой, рана-рана, падайце ж вадзічкі.
Падайце ж вадзічкі з халоднай крынічкі,
Ой, рана-рана з халоднай крынічкі.
Цяжка ж мне стаяці, каласком махаці,
Ой, рана-рана, каласком махаці.
Каласком махаці, галаском крычаці,
Ой, рана-рана, галаском крычаці.
Вы ж мяне сажніце, у снапкі павяжыце,
Ой, рана-рана, у снапкі павяжыце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У снапкі павяжыце, у копачкі складзіце,
Ой, рана-рана, у копачі складзіце.
У копачкі складзіце, цапамі аббіце,
Ой, рана-рана, цапамі аббіце,
Цапамі аббіце, жорнамі змяліце,
Ой, рана-рана, жорнамі змяліце.
Жорнамі змяліце, праскуркі напячыце,
Ой, рана-рана, праскуркі напячыце.
Праскуркі напячыце, у храм аднясіце,
Ой, рана-рана, у храм аднясіце.
У храм аднясіце, людзей накарміце,
Ой, рана-рана, людзей накарміце.

На фоне гэтай песні да месца святкавання Купалля набліжаецца шэсце «русалак». Маладыя, прыгожыя, сінявокія дзяўчаты высокага росту, з распушчанымі валасамі, пераплеценымі рознакаляровымі стужкамі, павольна ідуць на пляцоўку. Апрануты русалкі ў доўгія, белыя сукенкі, на шыі ў іх вісяць маністы, на галовах — вякочнкі з кветак, жытнёвых каласоў, галінак бярозы. У руках «русалкі» трымаюць зялёныя галінкі. На чале шэсця — самая прыгожая дзяўчына, убраная уся зялёнымі галінкамі і рознымі краскамі.

Стаўшы ў радок парамі, «русалкі» ідуць у карагодзе «пляцень», які ўвасоблены .наступным чынам: першая пара, прайшоўшы скрозь «пляцень», узнімае рукі, пад якім аналагічным чынам праходзяць удзельніцы шэсця.

Падышоўшы да ўзвышша, частка «русалак» застаецца на пярэднім плане і, пагойдваючыся ў такт песні, павольна махаюць бярозавымі галінкамі, як бы ствараючы бярозавы гай. Трое русалак становяцца на фоне дэкаратыўнага сонца.

1-я РУСАЛКА: Мы, русалкі-палудніцы,
Жывём у вадзе
І выходзім у поле,
Калі жыта цвіце,

2-я РУСАЛКА: Сцеражом мы ярыцу,
Каб калоссяў ніхто не ламаў,
Усяляку пашніцу,
Каб расіцу ніхто не абтрасаў.

3-я РУСАЛКА: І сягоння на свяце
Будзем мы ў карагодзе гуляць,
Будзем мы ў карагодзе гуляць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Песні пець і людзей чараваць.

Гучыць музыка. Русалкі збіраюцца ў маляўнічую пластычную кампазіцыю і, выконваючы русальны танок, спяваюць:

На граной нядзелі
Русалкі сядзелі,
Рана-.ранюсенька
Русалкі сядзелі.
Русалкі сядзелі, на дзевак глядзелі,
Ой, рана-рана, на дзевак глядзелі.
Дзявіцы, сястрыцы,
Падайце вадзіцы,
Ой, рана-рана,
Падайце вадзіцы-
Падайце вадзіцы
З халоднай крыніцы,
Ой, рана-рана,
З халоднай крыніцы.
З халоднай крыніцы,
Ды з-пад той вярбіцы,
Ой, рана-рана,
Ды з-пад той вярбіцы.
Падайце вадзіцы
Душу прычасціці,
Ой, рана-рана.
Душу прычасціці.
Душа прычасціцца —
Жыццё вараціцца,
Ой,рана-рана,
Жыццё вараціцца.
Тады будзем з вамі
Краскі сабіраці,
Ой, рана-рана,
Краскі сабраці.
Краскі сабіраці,
Песенькі пяяці,
Ой, рана-рана,
Песенькі пяяці.

У канцы танца, пакланіўшыся, «русалкі» пад музыку па-дыходзяць да ўдзельнікаў свята. Яны надзяляюць удзельнікаў свята кветкамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галінкамі дрэў, вянкамі і запрашаюць у карагод. Гучыць музыка, і «русалкі» разам з запрошанымі водзяць карагод, далучаючы да ўдзелу ў ім усё новых і новых купалак. У канцы карагода ў цэнтр круга выходзяць Купалінка і «галоўная русалка». Да вогнішча падыходзяць таксама купалкі з вянкамі русалак.

ГАЛОЎНАЯ РУСАЛКА(здымаючы з галавы вянок):

У старадаўнюю забаву з намі пагуляйце,
Як паляцяць вянкі ў агонь, ад кастра ўцякайце,
Русалкі не стануць вас шкадаваць —
Будуць лавіць вас і ласкатаць.

Пад музыку «галоўная русалка» і купалкі кідаюць вянкі ў палаючае вогнішча. Дзяўчаты разбягаюцца ў розныя бакі Пачынаецца масавая жартоўная гульня, русалкі ловяць непа-варотлівых дзяўчат і казычуць іх. Усюды чутны смех, пануе весялосць.

Чуваць напеўная мелодыя цымбалаў. На фоне «сонца» з'яўляецца Купалінка.

КУПАЛІНКА: Правядзём русалак
Із бору да бору,
Із бору да бору,
У зялёну дуброву.
Штоб не ласкаталі,
У зіму не лякалі,
У зіму не лякалі,
Улетку не пужаль
Правядзём русалак
Із бору ў жыта,
У ядраном жыце
Там русалкам жыці.

Фальклорны калектыў выконвае песню, на фоне якой русалкі збіраюцца ў гурт і ў суправаджэнні некалькіх купалак пакідаюць свята. Гучыць развітальны напеў:

Прывяду русалак
У зялёнае жыта,
Рана-рана,
У зялёнае жыта.
Там русалкі ў жыце
Зялёным сядзелі,
Рана-рана,
Зялёным сядзелі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А мой каласочак,
Як яварочак,
Рана-рана,
Як яварочак.
А мая жыцінка,
Як праскурачка,
Рана-рана,
Як праскурачка.
У печцы піражком,
На стале калачком,
Рана-рана,
На стале калачком.
Прывяду русалак
У ядраное жыта,
Ой, рана-рана,
У ядраное жыта.
У ядраном жыце
Там русалкам жыці,
Ой, рана-рана,
Там русалкам жыці.

**«ПЛЫВІ, ПЛЫВІ, ВЯНОЧАК»**

Да вогнішча выходзіць юнак і ўзнімае сурму. Гучыць па-чатковы радок беларускай народнай песні «Ой, рана, на Йвана».

КУПАЛІШ: Сёння Купала, заўтра Ян,
Пайшлі дзевачкі ў зялёны гай,
Павілі дзевачкі вяночкі,
Паняслі іх ў таночкі,
Паклалі на галовачкі,
Каб дзівіліcь парубочкі
На харошыя вяночкі.

КУПАЛІНКА: Станьце, дзевачкі, у кружочак,
Паварожым на вяночак;
Мы вяночак развіваем
Ды на долечку гадаем:
Калі ваша добрая доля
Цвіці, вяночак, як гаёчак.
Калі й ваша бяздоллейка—
Ссохні, вяночак, як сухарочак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучыць музыка. Купалкі запрашаюць дзяучат у круг. У цэнтры круга становіцца Дзеўка-купалка — прыгожая дзяўчына, якая ўпрыгожана кветкамі, травамі. Вочы яе завязаны хусткай. На руках вісяць засохлыя і свежыя вяночкі. Над музыку дзяўчаты ідуць па кругу, а купалка надзяляе іх вянком-доляй: каторай дастанецца свежы вянок — той жыць багата й весела, а каторай завялы — той не пашанцуе. Пасля гульні-варажбы ў цэнтр круга дзяўчаты ўносяць «май»— бярозку, якая засталася ад сёмухі.

КУПАЛІНКА: А цяпер, дзяўчаты, кідайце вашы вянкі на бле-бярозу. Калі ваш вянок утрымаецца на бярозе — вас хутка спаткае каханне. Жадаюць шчасця!

Гучыць музыка. Дзяўчаты кідаюць вянкі на бярозу і весела абмяркоўваюць вынікі варажбы.

КУПАЛІНКА: Разыдзіся, наш кружочак,
Зноў варожым на вяночак.
Падыдзіце да кастрышча,
Пачнем новае ігрышча:
Чый вянок згарыць хутчэй —
Тая выйдзе замуж раней.

КУПАЛІШ: Калі хлопец з вогнішча выхапіць вянок—
Тая дзяўчына запросіць яго ў танок.

Пад музыку дзяўчаты кідаюць вянкі ў касцёр. Пачынаецца гульня-варажба, пасля якой фальклорны ансамбль выконвае польку-весялуху. Моладзь танцуе. Гучыць мелодыя беларускай народнай песні «Купалінка».

КУПАЛІНКА: Знімайце, прыгажуні, свае дзявоцкія кароны, нясіце іх дару вадзяному, а ён скажа, каму ў гэтым годзе .выпадзе шчасце.

Пачынаецца шэсце да ракі ці возера. Парадак шэсця:

—Чатыры дзяўчыны ў беларускіх нацыянальных строях, нясуць на высока ўзнятых руках невялічкі плыт. На гэтым плыце ляжыць вялізны вянок, сплецены з галінак бярозы, дуба, вярбы. Унутры вянка палае агонь.

—Чатыры юнакі з палаючымі паходнямі.

—Музыкі.

—Дзяўчаты, удзельуніцы купальскай варажбы, якія нясуць у руках вяночкі з палаючымі свечкамі.

—Фальклорны калектыў, які спявае пені.

—Астатнія удзельнікі свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У час шэсця гучыць купальская песня:

Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зеляненькім.
А ў лузе цвітуць вяночкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі.
Многа песень спета
Пра шчодрае лета,
Толькі Ганначка не спявае,
У буйных травах кветкі збірае.
Кветкі збірае
Ў вянок уплятае.
— Пакаціся, вяночак, у дварочак,
Дзе жыве мой мілы дружочак.
Хай ён знае, знае,
Хто яго чакае,
Хай вячэрняй роснай пароюЎ луг зялёны прыйдзе за мною.
Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зеляненькім,
А ў лузе цвітуць цвяточкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі.

Падышоўшы да ручаіны, ракі ці возера, усе спыняюцца. Пад мелодыю беларускай народнай песні «Купалінка» хлопцы з паходнямі заходзяць у ваду і запальваюць кола – сімвал сонца, якое трымаецца на шасце, што умацаваны на нерухомымплыце. Дзяўчаты апускаюць на ваду вялікі вянок з палаючым агнём, які павольна гайдаецца на хвалях і плыве. Фалыклорны калектыў выконвае купальскую песню:

Купала, Янава ночка невялічка, Купала,
Нашы дзевачкі ўсю ноч не спалі,Купала,
Усе зязюленькі, усе шчабяталі, Купала,
Дзевачкі, з руты вянкоў не віце, Купала,
Дзевачкі, рана замуж не йдзіце, Купала,
Віце вяночкі ды із чабору, Купала,
Ідзіце замуж ды ўпору, Купала.

(г. п. Лоеў Гомельскай вобл.)

КУПАЛІШ: Сягоння Яна-Купала,
Дзевачкі кветкі збіраюць,
Да й у вяночкі сплятаюць,
Да й на вадзіцу пушчаюць.

КУПЛІНКА: Пльві, вяночак,
Плыві, зялёненькі,
Пакажы, ці лёс мне
З міленькім, родненькім.

Дзяўчаты, трымаючы ў руках вяночак з запаленай свечачкай, па чарзе падых апускаючы вянкі на ваду, прыгаворваюць:

—Хай будзе адзін, ды ладны.
—З тварам да вянца, а з розумам да канца.
—Ці з перцам, ці не з перцам,
—Абы са шчырым сэрцам.
—Калі любіш — ажаніся,
—А не любіш — адкажыся.
—Хоць вох, ды ўдвох. (і да т. п.)

Гучыць пяшчотная лірычная мелодыя. Паволі плывуць па хвалях вяночкі, пабліскваючы агеньчыкамі, а дзяўчаты, ідучы ўздоўж берага, пільна сочаць за сваімі вянкамі... Хай напаткае іх радасць, вялікае каханне і шчаслівы лёс.

**«ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА»**

На месца дзеяння выходзіць сурмач. Гучыць пачатковы радок беларускай народнай песні «Ой, рана, на Йвана». У эфіры серабрыстымі званочкамі звініць мелодыя цымбалаў.

КУПАЛІНКА: Летняя ночка купальная... Ноч, чаруючая сваім хараством, прыгажосцю... У гэтую ночку, як гавораць народныя паданні, рэкі бліщчаць незвычайным святлом, дрэвы пераходзяць з месца на месца і вядуць гутарку між сабой...

КУПАЛІШ: Кажуць людзі, на Купалле
Ў кожным лесавым куточку
Кветка-папараць усходзе,
Зацвітае ў гэту ночку.
Адшукаць туды дарогі,
Дзе яна красуе, цяжка:
Настаўляюць чэрці рогі,
Ведзьмы скачуць у расцяжку.

КУПАЛІНКА: Лесуны выходзяць з нетраў
І русалак карагоды,
Вадзянік і сорак ветраў
Там з'яўляюцца заўсёды.

КУПАЛІШ: Узнімаюць ведзьмы скогат,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лемантуюць дзіка чэрці,
Каб шукальніка якога
Напалохаць аж да смарці

КУПАЛ1НКА: А чаму? Хто кветку-знойдзе,
Возьме гэту кветку ў рукі
Шчасця з'явіцца ў народзе,
Будуць людзі жыць без мукі.

За межамі пляцоўкі чутны шум ветру і раскаты грому (тэатральныя эфекты, або гукі фанаграмы), дзікі рогат, крыкі, лямант і да т. п.

КУПАЛІШ: Ну вось, не абышлося ў нас без нячысцікаў...

КУПАЛІНКА: Але не хвалюйцеся, людзі добрыя, госцейкі дарагія. Галоўнае — не даць ведзьмам агню з нашага купальскага кастра. А калі што якое, дык хвашчыце іх крапівой і палыном. Яны спрадвеку баяцца гэтага «лякарства».

Пачынаецца шэсце «нячыстай сілы», якое адбываецца адначасова на сушы і на вадзе: на плытах і лодках да месца правядзення свята набліжаюцца прадстаўнікі «Чарнабогава царства цемры». У складзе шэсця:

ВАДЗЯНІК, абросшы вадаростамі, з перапончатымі лапамі, царскай каронай на галаве, у масцы з вялізнымі вачыма, доўгімі валасамі і барадой, на нагах — ласты.

ЧЭРЦІ з рожкамі на галаве і доугімі хвастамі. Твары і рукі чарцей вымазаны сажай.

ВЕДЗЬМЫ ў масках з вялікімі ікламі, з метламі ў руках.

ЛЕСАВІК — стары дзед з мохавай барадой і валасамі. Ён апрануты ў вывернуты кажух, на якім начэплены галіны

ЯШЧАР з вялікай пашчай, з якой ідзе дым (маска), ікламі і з вялізным хвастом.

ЦЁТКА-ТРАСАВІЦА — багіня хвароб, старая баба ў масцы жабы.

КАРАЧУН І ПЯРЭПАЛАХ — пасланцы багіні смерці Мары. На галаве ў іх маскі ў выглядзе людскіх чарапоў, з вачыма, якія свецяцца (вочы намазаны фосфарнай фарбай або падсвечаны маленькімі электралямпачкамі ад батарэйкі).

Прыбыўшы да вогнішча, пераапранутыя пад акампанемент сваёй музыкі выконваюць танец нячысцікаў, а затым узнімаюцца на ўзвышша.

ЧОРТ: Я пачуў ваша гулянне,
У сваім пекле пад вадою....
І цяпер вось на патэльні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Граю свой напеў пякельны...

(Пачынае біць у патэльню лыжкай, астатнія чэрці падтанцоўваюць.)

Можа, вугалёк дасцё мне,
Каб агонь раскласці ў пекле?

КУПАЛІШ: Бачым, што махляр ты пекны!

КУПАЛІНКА: На, палын нясі ў пекла!

(Кідае палын на чарцей, якія з дзікім віскам і лямантам адбягаюць.)

ВЕДЗЬМА (любуючыся ў люстэрка).

Прыгажуні мы, ведзьмы — дзявіцы,
Шчабятушкі, шаптунні-сястрыцы
Просім з намі ў гульні гуляць
І нікога ў лес не пускаць.
Ну, навошта вам кветку шукаць?
Лепей хлопцаў,дзяўчат чараваць!

Ведзьмы чапляюцца да маладых хлопцаў і дзяўчат і спрабуюць іх казытаць. У гэты час адна з ведзьмаў хапае з вогнішча палаючую галінку і спрабуе ўцячы ў лес, але ўдзельнікі свята хвошчуць яе крапівой, палыном, адбіраюць агонь і праганяюць.

На узвышша ўзлятае раз'юшаны лясун.

ЛЯСУН: Я лясун, лясун сярдзіты,
Не спушчу нідзе нікому!
Не хадзі ніхто ў ночы,
Не чапай маіх харомаў.
Кветку пільна я вартую,
На замкоў замкнёна сорак,
А дарожку дам такую —
Людскіх костачак узгорак. (Смяецца.)

На фоне гэтых слоў «нячысцікі» акружаюць вогнішча. Гучыць несусветная какафонія гукаў.

ВАДЗЯНІК Па загаду Чарнабога
У лес не пусцім мы нікога.,
Ведзьмы, чэрці, што стаіцее?
Ад кастра ўсіх ганіце!

«Нячысцікі» ідуць на людзей, пачынаюць апырскваць іх вадой з балончыкаў, абгорнутых імхом.

КУПАЛІНКА: Нечысць Чафнабога,
Вам у лес дарога,
У раку глыбокую,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На асіну высокую.

Купаліш пачынае граць на жалейцы вясёлую мелодыю. КУПАЛІНКА: Ганіце, людзі добрыя, адсюль нячысцікаў, каб не псавалі нам свята! Палыну ды крапівы ім!

Фальклорна-інструментальны ансамбль падхоплівае вясёлы найгрыш Купаліша. Людзі пачьнаюць хвастаць «нячыстую сілу» крапівой і палыном. «Нячысцікі» з лямантам, войканнем, крыкамі спешна грузяцца ў лодкі і адплываюцъ. У зфіры— мелодыя цымбалаў.

КУПАЛІШ: Расцерушыла ночка свой цёмны пыл, распляла над зямлёй свае чорныя косы, сама, як маці, прытаілася ў лесе, каб вартаваць і ахоўваць сон людзей і сон прыроды.

КУПАЛІНКА: А каб на зямлі не было так маркотна ў час яе прыходу, яна пазмятала з неба ўсе хмаркі, і яно заззяла тысячамі рознакаляровых агеньчыкаў-зорачак...

КУПАЛІШ: Толькі чалавек шукае ў гэтую ночку кветку папараці, бо кажуць, што ў купальскую ноч зацвітае яна агністым цветам.

КУПАЛІНКА: Запрашаем вас на пошукі папараці-кветкі, якая ззяе рознакаляровымі агеньчыкамі і знаходзіцца недалёка ад вогнішча.

КУПАЛІШ: Хто кветачку шчасця сёння адшукае,
У падарунак ад Купалы вянок атрымае!

Гучыць вясёлая музыка. Удзельшкі свята ідуць на пошукі папараць-кветкі. Гэта дзеянне павінна адбывацца не больш за 5—10 хвілін, каб не страціць тэмпарытм свята. [Папараць-кветка ўяуляе сабой букет з папараці, васількоў, дзягілю, браткоў, руты, падсвечаных знутры рознакляровымі лямпачкамі. Гэты букет знаходзіцца на адлегласці 100—150м ад вогнішча і можа быць схаваны ў дупле дрэва, сярод поля кветак, на гары альбо ў вадзе.]

У час пошуку папараць-кветкі «нячысцікі», схаваўшыся ў розных патаемных кутках лесу, перашкаджаюць удзельнікам свята: вадзянік аблівае усіх вадой, чэрці страшаць дзікім рогатам, русалкі ласкочуць асобных удзельнікаў свята... Тут фантазія арганізатараў і ўдзельнікаў свята можа быць неабмежаванай, але ў прыстойных рамках і ў межах народных традыцый. Нарэшце гульня скончана. Чуюцца галасы: «Знайшлі, знайшлі папараць-кветку!». Удзельнікі свята песняй сустракаюць пераможцу гульні, у руках якога ззяе, пераліваецца усімі колерамі вясёлкі папараць-кветка. Калі юнак ці дзяўчына, што знайшлі кветку, узнімаецца на ўзвышэнне, пляцоўка асвятляецца рознакаляровым святлом. Гучаць сурмы, музыкі граюць урачыстую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мелодыю. Да уладальніка папараць-кветкі падыходзяць Купалінка і купалкі з узнагародамі.

КУПАЛІНКА (ускладаючы на галаву пераможцы вянок):

Хай лёс твой будзе шчаслівы,
У хаце хай будзе весела.
І сытна, і мірна, і песенна.

КУПАЛКІ (уручаючы падарункі):

—Хай доля ад бед уратуе,
—Зязюля шмат год накукуе,
— Хай без працы не збэсцяцца рукі,
—Хай будуць здаровы дзеці і унукі.

Фальклорна-інструментальны ансамбль грае польку.

КУПАЛІНКА: А зараз мы просім уладальніка кветкі шчасця адшукаць сярод дзяўчат самую прыгожую, на яго погляд, купалку і запрасіць яе на танец.

Пачынаецца танец пераможцы свята. Фальклорны калектыў спявае:

Дзяўчына-сардэнька,
Выйдзі пад акенка,
Прынясі, дзяўчыне
Яблыка красьненька.
Прынясі адное,
Прынясі другое,
Ой, выйдзі, дзяўчына,
Ты сардэнька мое!
Не выйду, не выйду,
Бо людзей баюся,
Будуць гаварыці —
З табою люблюся.
Няхай пагавораць,
Мы іх не баімся,
Пройдзе та нядзеля,
На шлюб станавімся.
Станем мы на шлюбе
Абое цясьненька,
Няхай пагавораць
Людзі галасненька.

У час танца купалкі па чарзе падыходзяць да пары са зззяючай кветкай папараці і асыпаюць іх пялёсткамі кветак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## «НА КУПАЛА СОНЦА ЙГРАЛА»

Гучаць сурмы і напеўная мелодыя цымбалаў.

КУПАЛІНКА: Пойдзем, людзі, да ракі
Купальскую ночку праважац,

КУПАЛІШ: Пойдзем, людзі, да ракі
Сонца сустракаці,

КУПАЛІНКА: На світанку купаціся
І ў расе качаціся

РАЗАМ: Пойдзем, людзі, да ракі!

На фоне музыкі пачынаецца шэсце. Наперадзе ідуць чатыры хлопцы з паходнямі, запаленымі ад купальскага кастра. За імі наступныя чатыры хлопцы нясуць маленькі плоцік, на якім умацаваны сімвал Купалля — кола на шасце. За імі ідуць фальклорны калектыў і астатнія ўдзельнікі свята. Па дарозе да ракі гучаць песні, у якіх назвы мясцін можна мяняць:

Ой, Іванава сонейка
Хадзіла, хадзіла.
Харашэнька ўзышло .на Івана*
(Паўтараецца пасля кожных двух радкоў.)
—А дзе яму стаці?
— У Збуражы на вулщы,
А ў Збуражы малайцы,
Як красныя панічы,
А ў Збуражы дзеўкі,
Як красныя паненкі,
А ў Збуражы маладзіцы,
Як белыя лебядзіцы.

(Маларыцкі р-н)

Ці:

Ой, рана, на Йвана (паўтарецца перад і пасля
кожнага радка).
Кругом сонца ходзе—
Недзе сонцу станавіцца.
Станавілася сонца ў Рогаве,
А ў Рогаве дзеукі гладкі,
Дзеўкі гладкі — глядзець гадка.
Кругом, кругом сонца ходзе,
Станавілася сонца ў Шчарбінішчах,
А ў Шчарбінішчах дзеукі худы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзеукі худы, глядзець люба.

(Новазыбкаусю р-н).

Але вось шэсце падыходзщь да ракі. Ужо ружавеюць воблакі на ўсходзе, над вадою сцелецца туман.

На заду апускаецца плыт з колам, а па яго канцах становяцца хлопцы з паходнямі Наступае цішыня, і толькі чутны шевы першых птушак. Усе чакаюць усходу сонца. Вось першыя залатыя промні дакранаюцца да зямлі, з-за небасхіла паступова вырастае сонца. І менавіта ў тэты момант гучыць песня:

А на Купалу
Рана сонца йграла,
Рана сонца йграла
На добрыя годы,
На добрыя годы,
На цёплыя росы,
На цёплыя росы,
На хлябы-ўраджаі,
На хлябы-ўраджаі.

(в. Барсукі Віцебскага р-на, Суражскі р-н).

На фоне песні хлопцы запальваюць кола і пускаюць плыт па рацэ. Дзяўчаты раскідваюць вакол плыта кветкі вянкі і ў гэтым прыгожым match рознакаляровым акружэнні плыве палаючае кола, абвяшчаючы канец Купалля. Гучыць урачыстая музыка.

КУПАЛІНКА: Вось і закончылася нашае Купалле — свята росквіту зямлі, свята народнай тврчасці...

КУПАЛІШ: Праводзілі мы сонца на другую палову года.

КУПАЛІНКА: Хай і ў гэтай палавіне года
Кветка шчасця будзе ў народа,

КУПАЛІШ: Каб на зямлі калоссе рассцілалася
Ды шмат хлеба урадзілася,

КУПАЛІНКА: Каб адзін аднаго паважалі,
Бацьку з маці не забывалі,

КУПАЛІШ: Нашу спадчыну шанавалі,
Ды купальскую ноч успаміналі

КУПАЛІНКА: І няхай дапамогуць вам у гэтым рукі — чыстыя ад купальскай вады...

КУПАЛІШ: Ногі, дужыя ад купальскіх карагодаў...

КУПАЛІНКА: Сэрцы, гарачыя ад купальскіх кастроў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фальклорны калектыў выконвае беларускую народную песню «Ой, рана, на Йвана».

Свята закончана. Жадаючыя могуць пакупацца ў цёплай, як сырадой, вадзе, па,качацца ў расе. ідучы са спевамі дамоў, дзяўчаты вешаюць вянкі на рогі сваёй карове, якую ўжо выганяюць у поле, чапляюць на вуглы хат, дзе жывуць нежанатыя хлопцы.

**Аўтары А. М. Аляхновіч, П. А. Гуд**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РУСКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

### Сацыялогія

Адаптация — адаптацыя
Альтернативный вопрос — альтэрнатыўнае пытанне
Анализ документов — аналіз (-зу) дакументаў
Анализ ситуаций — аналіз (-зу) сітуацый
Анализ социологической информации — аналіз (-зу) сацыялагічнай інфармацыі
Аналитико-экспериментальный план — аналітыка-эксперыментальны план,-на
Анкетер — анкецёр, -ра
Анкетное обследование — анкетнае абследаванне
Анкетный опрос — анкетнае апытанне

Банк социологических данных — банк (-ка) сацыялагічных даных
Безличный документ — безасабовы дакумент, -та
Бланк анкеты— бланк (-ка) анкеты
Бланк интервью — бланк (-ка) штэрв'ю
Большая группа — вялжая трупа
Буферный вопрос — буфернае пытанне
Бюджет времени •— бюджэт (-ту) часу

Вариант мотивации — варыянт (-та) матывацыі
Вариант ответа — варыянт (-та) адказу
Вариант решения проблемы — варыянт (-та) вырашэння праблемы.
Величина интервала — велічыня інтэрвалу
Величина шага выборки — велічыня шагу выбаркі
Вербальная деятельность — вербальная дзейнасць
Верификация — верыфікацыя
Включенное наблюдение — уключанае назіранне
Внешний анализ — вонкавы аналіз, -зу
Внутренний анализ — унутраны аналіз, -зу
Вопрос анкеты — пытанне анкеты
Вопрос-воронка — пытанне-варонка
Вопрос-индекс — пытанне-індэкс, -са
Вопрос-индикатор — пытанне-індыкатар, -ра
Вопрос-ловушка — пытанне-пастка
Вопрос-мнение — пытанне-меркаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вопрос о статусе — пытанне аб статусе
Вопрос-тест — пытанне-тэст, -та
Вопросы-диалоги — пытанньдыялоп
Воспроизводство связей (структур) — узнаўленне сувязей (структур)
Вторичный анализ — другасны аналіз, -зу
Вторичный документ — другасны дакумент, -та
Выборка — выбарка
Выборочная совокупность — выбарачная сукупнасць
Выборочный метод — выбарачны метад, -ду

Генеральная совокупность — генеральная сукупнасць
Гипотеза-основание — гіпотэза-аснова
Гипотеза-следствие — гіпотэза-вынік, -ку
Гипотеза социологического исследования — гіпотэза сацыялагічнага даследавання
Глобальная проблема — глабальная праблема
Глубокий опрос — глыбокае апытанне
Группа населения —група насельніцтва.
Группировка — групоўка
Группировка респондентов — групоўка рэспандэнтаў
Групповая сплоченность — групавая згуртаванасць.

Данные эксперимента — даныя эксперымента.
Демографическая политика — дэмаграфічная палітыка
Детерминация — дэтэрмінацыя
Дефиниция — дэфініцыя
Дисперсионный анализ — дысперсійны аналіз, -зу
Дисперсия — дысперая
Дихотомическая шкала наименований — дыхатамічная шкала найменняў
Документальная информация — дакументальная інфармацыя
Документальный источник — дакументальная крынша
Дополнительный вопрос — дадатковае пытанне
Дополнительный метод — дадатковы метад, -ду
Допустимая ошибка — дапушчальная памылка
Достоверность документа —верагоднасць дакумента
Достоверный прогноз — верагодны прагноз, -зу
Достоверный факт — верагодны факт, -та

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Единица анализа — адзінка аналізу
Единица наблюдения — адзінка назірання
Единица счета — адзінка ліку

Завершение опроса — завяршэнне апытання
Задача исследования — задача даследавання
Законы прикладной социологии — законы прыкладной сацыялогіі
Закрытый вопрос — закрытае пытанне

Идентификация — ідэнтыфікацыя
Измерительная шкала — вымяральная шкала
Индекс — індэкс, -са
Индивид — індывід, -да
Индивидуализация — індывідуалізацыя
Индикатор — індыкатар, -ра
Инновация — інавацыя
Инструментарий социологического исследования — інструментарый сацыялаічнага даследавання
Интегральный показатель — інтэгральны паказчык, -ка
Интенсивность признака — інтэнаўнасць прыметы
Интервальная шкала наименований — інтэрвальная шкала найменняў
Интервью — інтэрв'ю
Интервьюер — інтэрв'юер, -ра
Интерпретация понятий — інтэрпрэтацыя паняццяў
Интерпретация результатов — інтэрпрэтацыя рэзультатаў
Интерпретация фактических сведений — інтэрпрэтацыя Фактычных звестак
Искажение факта — скажэнне факта
Исследователь — даследчык,-ка
Исследовательская гипотеза — даследчая гіпотэза
Исследовательская программа — даследчая праграма
Исследуемый признак — даследуемая прымета
Источник информации — крыніца інфармацыі
Исходные данные — зыходныя даныя
Итоговая таблица — выніковая табліца
Итоговая шкала — выніковая шкала

Карточка — карта
Карточка наблюдений — картка назіранняў
Качественная информация — якасная інфармацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Качественно-количественный анализ — якасна-колькасны аналіз, -зу
Качество заполнения анкет — якасць запаўнення анкет
Классификация объектов — класіфікацыя аб’ектаў
Ключевые понятия — ключавыя паняцці
Кодирование информации — кадзіраванне інфармацыі
Количественный анализ — колькасны анал!з, -зу
Коллектив — калектыу, -ву
Конкретно-социологическое исследование — канкрэтна-сацыялагічнае даследаванне
Консенсус — кансенсус, -су
Контент-анализ — кантэнт-анал!з, -зу
Контрольная группа — кантрольная группа
Контрольный вопрос — кантрольнае пытанне
Контрольный объект — кантрольны аб'ект, -та
Конфликтная ситуация — канфліктная сітуацыя
Концепция исследования — канцэпцыя даследавання
Корреляция качественных признаков — карэляцыя якасных прымет
Косвенный вопрос — ускоснае пытанне
Коэффициент корреляции — каэфіцыент (-та) карэляцыі
Коэффициент ранговой корреляции — каэфіцыент (-та) рангавай карэляцыі
Коэффициент связи — каэфіцыент (-та) сувязі
Краевая перфорация — краявая перфарацыя
Культурная интеграция — культурная інтэграцыя
Культурная революция — культурная рэвалюцыя

Латентно-структурный анализ — латэнтна-структурны аналіз,-зу
Лексика опроса — лексіка апытання
Лидер — лідэр, -ра
Личность — асоба
Логика разработки программы — логіка распрацоўкі праграмы
Логика социологических исследований — логіка-сацыялагічных даследаванняў
Логический анализ результатов — лагічны аналіз (-зу) вынікаў
Локализация проблемы — лакалізацыя праблемы
Локальное исследование — лакальнае даследаванне

Малая группа — малая група
Малая подвыборка — малая падвыбарка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Манипулирование — маніпуліраванне
Массовая коммуникация —масавая камунікацыя
Массовая культура—масавая культура
Массовое сознание — масавая свядомасць
Массовый опрос — масавае апытанне
Математическая обработка  информации — матэматычная апрацоўка інфармацыі
Материалы социологических исследований — матэрыялы сацыялагічных даследаванняў
Машинописный документальный источник — машынапісная дакументальная крыніца
Медиана — медыяна
Межличностная коммуникация — міжасабовая камунікацыя
Метличностные отношения — міжасабовыя адносіны
Мера несвободы в деятельности — мера несвабоды ў дзейнасці
Мера свободы в деятельности — мера свабоды ў дзейнасці
Метод абстрагирования — метод (-ду) абстрагавання
Методика контент-анализа — методыка кантэнт-аналізу
Методика массового обследования  — методыка масавага абследавання
Методика составления анкеты—методыка састаўлення анкеты Методика социологических исследований — методыка сацыялагічных даследаванняў
Метод парных сравнений — метад (-ду) парных параўнанняў
Метод полярных профилей — метад (-ду) палярных профіляў
Метод сбора первичных данных — метад (-ду) збору першасных даных
Метод социологического исследования — метад (-ду) сацыялагічнага даследавання
Метод эмпирического исследования — метад (-ду) эмпірычнага даследавання
Метрическая шкала — метрычная шкала
Метрическая шкала равных интервалов — метрычная шкала роўных інтэрвалаў
Миграция населения — Міграцыя насельніцтва
Мнение — думка
Многомерное шкалирование —  мнагамернае шкаліраванне
Модель — мадэль

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Модификация ответа — мадыфікацыя адказу
Мораль — мараль
Мотив — матыў, -ву
Мотивационный вопрос — матывацыннае пытанне
Мотивация — матывацыя
Мотив деятельности.— матыў (-ву) дзейнасці
Наблюдение — назіранне
Надежность документа — надзейнасць дакумента
Надежность информации — надзейнасць інфармацыі
Надежность исходной информации — надзейнасць зыходнай інфармацыі
Наркомания — наркаманія
Народонаселение — народанасельніцтва
Натуральная единица — натуральная адзінка
Натуральный показатель — натуральны паказчык, -ка
Научно-техническая революция — навукова-тэхнічная рэвалюцыя
Нейтральная позиция интервьюера — нейтральная пазіцыя інтэрв'юера
Неупорядоченная шкала наименований — неўпарадкаваная шкала найменняў
Неформальная организация — нефармальная арганізацыя
Номинальная шкала — намінальная шкала

Обоснованность исходной информации — абаснаванасць зыходнай інфармацыі
Обработка данных — апрацоўка данных
Обследуемое лицо — асоба, якая абследуецца
Образ жизни — уклад (-ду) жыцця
Общественная проблема — грамадская праблема
Общественное бытие — грамадскае быццё
Общественное мнение — грамадская думка
Общественное сознание — грамадская свядомасць
Общественные нравы — грамадскія норавы
Обыденное сознание — звычайная свядомасць
Обычай — звычай, -чаю
Объект изучения — аб'ект вывучэння
Объект описания — аб'ект (-та) апісання
Объект социологического исследования — аб'ект (-та) сацыялагічнага даследавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Объяснение — тлумачэнне
Объяснительная гипотеза — тлумачальная гіпотэза
Операциональное определение — аперацыянальнае вызначэнне
Описательная гипотеза — апісальная гіпотэза
Опрос — апытанне
Опрос-молния — апытанне-маланка
Опросный лист — апытальны ліст, -та
Опросный метод — апытальны метад, -ду
Опрос общественного мнения — апытанне грамадскай думкі
Опытная проверка—доследная праверка
Ответ — адказ, -зу
Открытый вопрос — адкрытае пытанне
Отношения эквивалентности — адносіны эквівалентнасці
Отчуждение — адчужэнне
Официальный документ — афіцыйны дакумент, -та
Оценка достоверности — ацэнка верагоднасці
Оценочное -суждение — ацэначнае суджэнне

Панельное исследование — панельнае даследаванне
Первичное измерение — першаснае вымярэнне
Первичные данные — першасныя даныя
Первичный документ — першасны дакумент, -та
Печатный документальный источник — друкаваная дакументальная крыніца
Письменный документальный источник — пісьмовая дакументальная крыніца
План анкеты — план (-на) анкеты
Планирование социального развития — планаванне сацыяльнага развіцця
Повторный эксперимент — паўторны эксперымент, -та
Повторяемость связей (структур) — паўтаральнасць сувязей (структур)
Подгруппа — падгрупа
Подкласс — падклас, -са
Подлинность документа — сапраўднасць дакумента
Познавательные функции социологии — пазнавальныя функцыі сацыялогіі
Показатель взаимосвязи — паказчык (-ка) узаемасувязі
Поколение — пакаленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Полнота смысловых единиц — паўната сэнсавых адзінак
Положительная установка —станоўчая ўстаноўка
Полузакрытый вопрос — паўзакрытае пытанне
Последовательность разработки программы — паслядоўнасць распрацоукі прагрaмы
Потребительство — спажывальніцтва
Потребности — патрэбнасці
Предельная ошибка распределения — гранічная памылка размеркавання
Предмет социологического исследования — прадмет (-та) сацыялагічнага даследавання
Прикладная социология— прыкладная сацыялогія
Прикладные социологические исследования — прыкладныя сацыялагічныя даследаванні
Прикладные функции социологии — прыкладныя функцыі сацыялогі
Принцип случайных чисел — прынцып (-пу) выпадковых лікаў
Проблемная ситуация — праблемная сітуацыя
Пробное исследование — пробнае даследаванне
«Провокационный» вопрос — «правакацыйнае» пытанне
Программа социологического исследования — праграма сацыялагічнага даследавання
Проективный вопрос — праектыўнае пытанне
Простая номинальная шкала — простая намінальная шкала
Процедура интерпретации понятий — працэдура інтэрпрэтацыі паняццяў
Прямой вопрос — прамое пытанне

Рабочая гипотеза — рабочая гіпотэза
Рабочий документ — рабочы дакумент, -та
Разброс оценок — роскід (-ду) ацэнак
Ранговая шкала — рангавая шкала
Ранжирование по признаку — ранжыраванне па прымеце
Распределение функций — размеркаванне функцый
Рацыянальная норма — рацыянальная норма
Реальная деятельность — рэальная дзейнасць
Реальный факт — рэальны факт, -та
Регион — рэгіён, -ну
Репрезентативность — рэпрэзентатыўнасць
Респондент — рэспандэнт, -та

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Референтная группа — рэферэнтная група
Ритуал — рытуал, -лу
Руководство — кіраўніцтва
Ручная обработка — ручная апрацоўка

Самоуправление — самакіраванне
Сбор исходных даных — збор (-ру) зыходных-даных
Сбор первичной информации — збор (-ру) першаснай інфармацыі
Свободное время — вольны час, -су
Семантическая интерпретация понятий — семантычная інтэрпрэтацыя паняццяў
Система протоколирования ответов — сістэма пратакаліравання адказаў
Система социального измерения — сістэма сацыяльнага вымярэння
Систематизация-фактов — астэматызацыя фактаў
Систематизированный анализ событий — астэматызаваны аналз (-зу) падзей
Систематический отбор — сістэматычны адбор, -ру
Система шифров — сістэма шыфраў
Смысловая единица анализа — сэнсавая адзінка анализу
Собственность—уласнасць
Событийный вопрос — падзейнае пытанне
Совокупность документальных источников — сукупнасць дакументальных крыніц
Совокупность населения — сукупнасць насельніцтва
Совокупность событий — сукупнасць падзей
Содержание документа — змест дакумента
Социализация — сацыялізацыя
Социальная активность — сацыяльная актыўнасць
Социальная группа — сацыяльная група
Социальная закономерность — сацыяльная заканамернасць
Социальная иерархия — сацыяльная іерархія
Социальная интеграция — сацыяльная інтэграцыя
Социальная мобильность — сацыяльная мабільнасць
Социальная общность — сацыяльная агульнасць
Социальная позиция — сацыяльная пазіцыя
Социальная политика — сацыяльная палітыка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Социальная психология — сацыяльная псіхалогія
Социальная роль — сацыяльная роля
Социальная система —сацыяльная сістэма
Социальная ситуация — сацыяльная сітуацыя
Социальная справедливость — сацыяльная справядлівасць
Социальная статистика — сацыяльная статыстыка
Социальная удовлетворенность — сацыяльная задаволенасць
Социальная характеристика — сацыяльная характарыстыка
Социальная экология — сацыяльная экалогія
Социально-демографическая структура — сацыяльна-дэмаграфічная структура
Социально-демографические признаки — сацыяльна-дэмаграфічныя прыметы
Социальное взаимодействие — сацыяльнае ўзаемадзеянне
Социальное перемещение — сацыяльнае перамяшчэнне
Социальное противоречие — сацыяльная супярэчнасць
Социальное развитие — сацыяльнае развіццё
Социальное событие — сацыяльная падзея
Социальное управление — сацыяльнае кіраванне,
Социальное явление — сацыяльная з'ява
Социально-классовая структура — сацыяльна-класавая структура
Социально-профессиональная принадлежность — сацыяльна-прафесійная прыналежнасць
Социально-профессиональная структура — сацыяльна-прафесіянальная структура
Социально-профессиональные характеристики — сацыяльна-прафесійныя характарыстыкі
Социально-психологическая группа — сацыяльна-псіхалагічная група
Социально-психологический климат — сацыяльна-псіхалагічны клімат, -ту
Социально-статистический фактор — сацыяльна-статыстычны фактар, -ру
Социальные гарантии — сацыяльныя гарантыі
Социальные нормативы — сацыяльныя нарматывы
Социальные нормы—сацыяльныя нормы
Социальные ожидания — сацыяльныя чаканні
Социальные отношения — сацыяльныя адносіны
Социальные показатели — сацыяльныя паказчыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Социальные последствия — сацыяльныя вынікі
Социальные проблемы — сацыяльныя праблемы
Социальные противоречия — сацыяльныя супярэчнасці
Социальные различия — сацыяльныя адрозненні
Социальные резервы — сацыяльныя рэзервы
Социальные ценности — сацыяльныя каштоўнасці
Социальный детерминизм — сацыяльны дэтэрмінізм, -му
Социальный заказ — сацыяльны заказ, -зу
Социальный закон — сацыяльны закон, -ну
Социальный институт — сацыяльны інстытут, -та
Социальный интерес — сацыяльны інтарэс, -су
Социальный конфликт — сацыяльны канфлікт, -ту
Социальный процесс — сацыяльны працэс, -су
Социальный слой — сацыяльны слой, -я
Социальный статус — сацыяльны статус, -са
Социальный стереотип — сацыяльны стэрэатып, -па
Социальный факт—сацыяльны факт,-та
Социальный фактор — сацыяльны фактар, -ру
Социальный эксперимент — сацыяльны эксперымент, -ту
Социологическая ассоциация — сацыялагічная асацыяцыя
Социологическая информация — сацыялагічная інфармацыя
Социологическая концепция — сацыялагічная канцэпцыя
Социологическая  проблема — сацыялагічная праблема
Социологическая теория — сацыялагічная тэорыя
Социологические исследования — сацыялагічныя даследаванні
Социологические исследования клубной работы — сацыялагічныя даследаванні клубнай работы
Социологические методы исследования — сацыялагічныя метады даследавання
Социологические обследования — сацыялагічныя абследаванні
Социологический метод — сацыялагічны метад, -ду
Социологический центр — сацыялагічны цэнтр, -ра
Социограмма — сацыяграма
Социолог — сацыёлаг, -га
Социология —сацыялогія
Социология досуга — сацыялогія дасуга
Социология искусства — сацыялогія мастацтва
Социология культуры — сацыялогія культуры
Социология личности — сацыялогія асобы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Социология молодежи — сацыялопя моладзі
Социология общественного мнения — сацыялогія грамадскай думкі
Социология семьи — сацыялогія сям'і
Социометрический опрос — сацыяметрычнае апытанне
Социум — соцыум, -му
Специфика интересов — спецыфіка інтарэсаў
Сплошное образование — суцэльная адукацыя
Спонтаный ответ —.спантанны адказ, -зу
Способ регистрации данных — спосаб рэгістрацыі даных
Способ сбора исходных данных — спосаб збору зыходных даных
Сравнительное исследование — параўнальнае даследаванне
Среднеарифметическая ошибка — сярэднеарыфметычная памылка
Среднее арифметическое — сярэдняе арыфметычнае
Стабильность — стабільнасць
Стандартное отклонение — стандартнае адхіленне
Статястико-математмческие методы обработки информации— статыстыка-матэматычныя метады апрацоукі інфармацыі
Статистические материалы — статыстычныя матэрыялы
Статус-ролевая характеристика — статус-ролевая характарыстыка
Степень общности — ступень агульнасці
Степень свободы — ступень свабоды
Стиль жизни — стыль (-лю) жыцця
Структура досуга — структура дасуга
Структура коллектива — структура калектыву
Структурная гипотеза — структурная ппотэза
Структурно-функциональный анализ — структурна-функцыянальны аналіз, -зу
Субъект деятельности — суб'ект дзейнасці
Суждение — суджэнне
Суммарный индекс — сумарны індэкс, -са

Таблица сопряженности — табліца спалучанасці
Таблица экспертных оценок — табліца экспертных ацэнак
Текст анкеты — тэкст (-ту) анкеты
Текучесть кадров — цякучасць кадраў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тема исследования — тэма даследавання
Тенденциозность документа — тэндэнцыйнасць дакумента
Теоретико-прикладные исследования — тэарэтыка-прыкладныя даследаванні
Теоретическая концепция социологического исследования — тэарэтычная канцэпцыя сацыялагічнага даследавання
Теоретическая социология — тэарэтычная сацыялогія
Теоретически ориентированные социологические исследования — тэарэтычна арыентаваныя сацыялагічныя даследаванні
Теория личности — тэорыя асобы
Теория массовой информации — тэорыя масавай інфармацыі
Тест — тэст, -та
Тестирование — тэстыраванне
Техника контент-анализа — тэхніка кантэнт-аналізу
Техника составления анкеты — тэхніка састаўлення анкеты
Техника социологического исследования — тэхніка сацыялагічнага даследавання
Тип вопроса — тып (-пу) пытання
Тип документа — тып (-пу) дакумента
Тип личности — тып (-пу) асобы
Типологизаштя — тыпалагізацыя
Точечный коэффициент — кропкавы каэфіцыент, -та
Точность документа — дакладнасць дакумента
Традиционный (качественный) анализ — традыныйны (якасны) аналіз, -зу
Традиция — традыцыя
Упорядоченная номинальная шкала — упарадкаваная намінальная шкала
Упорядоченная шкала наименований — упарадкаваная шкала найменняў
Управленческое решение — кіраунічае рашэнне
Урбанизацыя — урбанізацыя
Уровень жизни — узровень жыцця
Условия деятельности — умовы дзейнасці
Условия социального бытия — умовы сацыяльнага быцця
Установка на вид деятельности — устаноўка на від дзейнаці
Устойчивость полученной информации — устойлівасць атрыманай інфармацыі
Устойчивость связей (структур) — устойлівасць сувязей (структур)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактическая база — фактычная база
Фактическое проявление социального явления — фактычнае праяўленне сацыяльнай з'явы
Фактическое содержание — фактычны змест, -ту
Факторный анализ — фактарны аналіз, -зу
Формализация данных — фармалізацыя данных
Формализованный (количественный) анализ — фармалізаваны (колькасны) аналіз, -зу
Формализованный опрос — фармалізаванае апытанне
Формулировка вопросов — фармуліроўка пытанняў
Функцыя прогноза — функцыя прагнозу
Футурология — футуралогія.

Характеристика по интересам — характарыстыка па інтарэсах

Целевая аудитория — мэтавая аўдыторыя

Целевая выборка — мэтавая выбарка

Цель исследования — мэта даследавання

Ценностная ориентация — цэнасная арыентацыя

Ценностные суждения — цэнасныя суджэнні

Ценность данных — цэннасць данных

Цивилизация — цывілізацыя

Частная социологическая теория — прыватная сацыялагічная тэорыя
Частота событий — частата здарэнняў
Человеческий фактор — чалавечы фактар, -ру
Человечество — чалавецтва
Численность (величина) выборки — колькасць (велічыня)
Выбаркі
Численность обследованных — колькасць абследаваных

Шаг выбарки — шаг (-гу) выбаркі
Шкала балльных оценок — шкала бальных ацэнак
Шкала отношений — шкала адносін

Эксперимент — эксперымент, -та
Экспериментальная группа — эксперыментальная група
Экспериментально-практический план — эксперыментальна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практычны план, -на
Экспертная оценка — экспертная ацэнка
Экспериментальный метод — эксперыментальны метад, -ду
Экспертный опрос — экспертнае апытанне
Эмпирическая интерпретация понятий — эмпірычная інтэрпрэтацыя паняццяў
Эмпирическая информация — эмпірычная інфармацыя
Эмпирические данные — эмпірычныя даныя
Эмпирическое социологическое исследование — эмпірычнае сацыялагічнае даследаванне
Этап социологического исследования — этап (-пу) сацыялагічнага даследавання
Этническая группа — этнічная група
Этнос — этнас, -су
Этносоциология — этнасацыялогія

Укладальнікі **І. Р. ГОЛУБЕВА**
**Н. А. СЯРМЯЖКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Литературно-художественное издание

**Олег Михайлович Алехнович, Петр Адамович Гуд, Ирина Григорьевна Голубева, Нина Андреевна Сермяжко**

**СЦЕНАРНО.МЕТОДИЧЕСКИЕ РЕКОМЕНДАЦИИ ПО ПРОВЕДЕНИЮ КЛУБНЫХ МЕРОПРИЯТИЙ**

На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

**Алег Міхайлавіч Аляхновіч, Пётр Адамавіч Гуд, Ірына Рыгораўна Голубева, Ніна Андрэеўна Сярмяжка**

**СЦЭНАРНА-МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ КЛУБНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ**

Рэдактар **Л. Савіцкая**

Падпісана да друку 19.04.91. Фармат 69х84$^1/_{16}$. Высокі друк. Гарнітура Літаратурная. Умоўн. друк.арк. Ул.-выд. арк. 3,0. Тыраж 1000 экз.
Заказ 1261. Цана 50 кап.
Беларускі інстытут праблем культуры
220029, г. Мінск, вул. А. Пашкевіч, 3.
Друкарня Белсаўпрофа. 220030, г. Мінск, пл. Свабоды, 23.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ